PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 37 (2470) Год XLVIII | Беласток, 14 верасня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Пародыя гісторыі

Мацей Халадоўскі

Дакладна ў палове верасня самаўрадавыя ўлады Падляшскага ваяводства і Канфедэрацыя дваровай шляхты з яе заснавальнікам, вядомым пісьменнікам Эдвардам Рэдлінскім, будуць у Беластоку гучна адсвяткоўваць „490 гадавіну ўтварэння Падляшскага ваяводства". 29 жніўня 1513 г. прывілеяй караля Жыгімонта Старога ваяводам тагачаснага падляшскага рэгіёна стаў Іван Сапега. Аб супярэчлівай ідэі абходаў тае гадавіны размаўляем з гісторыкам Алегам Латышонкам.

— Ці ў „тутэйшых" беларусаў, жыхароў былога Беластоцкага ваяводства, а ў сённяшніх адміністрацыйных межах — Падляшскага, ёсць гістарычная нагода святкаваць 490 гадавіну ўзнікнення Падляшскага ваяводства?

— Падстава ёсць якраз у беларусаў. Да Польшчы быў далучаны заходні лапік Падляшскага ваяводства ў 1569 годзе.

— У якіх акалічнасцях адбылося тое далучэнне?

— Сярод гісторыкаў прыняўся такі погляд. Большасць прысутнай тут шляхты пісала Жыгімонту Старому, каб увесці польскую мову як службовую. Аднак засталася руская, бо кароль адказаў: *Chaj budzie, jak było*. Аб далучэнні, аднак, не шляхта вырашала, а магнацкія роды. І ў заходняй частцы ў вырашаючай меры выказаліся яны за далучэнне да Польскай Кароны. На маю думку, шляхецкія масы мала што маглі тут сказаць. Магнацкія роды, якія бачылі тут свой інтарэс, аддалі свой голас за далучэнне да Кароны. Але, напрыклад, Хадкевічы звязвалі свой лёс з Літвой і цвёрда супрацьставіліся далучэнню іхных зямель да Кароны.

— Эдвард Рэдлінскі ў размове на інтэрнетавых старонках Падляшскай маршалкоўскай установы, спасылаючыся на падзеі 1513 г., сцвярджае: „У 80-90 працэнтах Падляшша засяліла Мазовія, што дало вынік у выглядзе прысутнасці нацыянальных меншасцей". Што вы скажаце наконт гэтага?

— Гэта бязглуздзіца. Рэдлінскі — вядомы пісьменнік, але ў гісторыі, як відаць, ніяк не разбіраецца. Не будзем пра гэта гаварыць.

— Ці ёсць падстава, у адносінах да сённяшняга Падляшскага ваяводства, як гэта адзначае Э. Рэдлінскі, для „прамоцыі нашага шляхецкага ваяводства" і падкрэслівання, што „istotą tożsamości naszego regionu jest kultura drobnoszlachecka"?

— Гэта мяне нават не хвалюе, а рассмяшае. Сапраўды, шляхты на тэрыторыі тагачаснага Падляшша было шмат, бо польскія каралі не шкадавалі шляхецкіх званняў мазаўшанам, каб пераканаць, што яны — палякі, хоць у са-

[працяг ☞ 2]

Фота Ганны Кандрацюк

Пачатак школьнага года ў ПШ н-р 4. У першым радзе шасцікласніцы з „беларускага" класа

Беларуская мова ў Беластоку

Ганна Кандрацюк

З новага навучальнага года ў Беластоку вядзецца навучанне беларускай мовы ў гімназіі. Пакуль што, група навучэнцаў невялікая — 9 асоб. У большасці гэта выпускнікі ПШ н-р 4, ПШ н-р 11 і раней — польска-беларускага садка. Навучанне арганізавана бацькамі ў адной з самых лепшых школ горада, Гімназіі н-р 7 што па вуліцы Сталэчнай. Беларускую мову, як замежную, будзе вывучаць група гімназістаў у I „ц" класе.

— Магчыма, што дойдуць яшчэ вучні з іншых класаў, — кажа настаўніца беларускай мовы Аліна Ваўранюк.

У гімназіі шэсць першых класаў і 170 вучняў. Выхавацелька I „ц" класа — настаўніца польскай мовы Уршуля Штабэльская-Копа.

Гэты I „ц" клас лічыцца элітарным. Сюды дабраныя гімназісты з самымі высокімі дасягненнямі ў вучобе.

* * *

Сёмы год запар вядзецца навучанне беларускай мовы ў ПШ н-р 4. Нашы навучэнцы заваявалі тут добрую славу і поспехі. Урокі вядуцца з першага па шосты клас.

— У першы клас запісалася сем асоб, — кажа Аліна Ваўранюк, якая ад пачатку выкладае тут родную мову.

Выхавацелька першага класа, дарэчы, ужо трэці раз — Ева Данэйка. Настаўніца, як першая ў гісторыі школы, вяла польска-беларускі клас — сённяшніх гімназістаў.

— Буду далей весці праект „Гульня ў тэатр", — адзначае Аліна Ваўранюк. — Будзем прымаць удзел у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова" і тэатральным аглядзе. Пяты і шосты клас будуць рыхтавацца да прадметнага конкурсу беларускай мовы.

У ПШ н-р 4 да 60 навучэнцаў беларускай мове. У асноўным, гэта выпускнікі беларускага прадшколля.

* * *

На будынку Самаўрадавага прадшколля н-р 14 дзве табліцы: польская і беларуская. Беларуская — тарашкевіцай.

Фота Ганны Кандрацюк

Новую табліцу для садка дафінансаваў пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы

— Новую табліцу падарыў нам пасол Рэспублікі Беларусь, — кажа Луцыя Неміровіч, дырэктарка садка. Справай табліцы пацікавілася асабіста жонка пасла, Наталля Латушка. Яна пазваніла дырэктар і сама прапанавала дапамогу. Раней, калі спадарства Латушкі працава-

[працяг ☞ 3]

Будзе новы сенатар ☞ 4

Мясцовыя палітычныя кланы масава рушылі змагацца за крэсла для свайго чалавека. Вядома, што выбарчая кампанія вядзецца за кошт дзяржаўнага бюджэту, а перамога — гэта ручаёк грошай у партыйную касу. Каталіцкія групоўкі пачалі выбарчую кампанію ў Гарадской радзе, забараняючы будаваць царкву ў адным з кварталаў Беластока. Разлічваюць яны, што такім чынам мабілізуюць касцельны электарат.

Стажоры з Беларусі ў Гайнаўцы ☞ 4

Беларускі самаўрадавы форум у РП з 25 па 28 жніўня арганізаваў у Гайнаўцы стажыроўку для самаўрадаўцаў, фермераў і журналістаў з Беларусі. Госці спаткаліся з мясцовымі самаўрадаўцамі, прадпрымальнікамі, гарадскімі і павятовымі чыноўнікамі.

Пасольства гатова аказваць садзеянне ☞ 5

Па меры магчымасці, беларуская дзяржава імкнецца выдаваць творы беларускіх аўтараў, што жывуць за мяжой. Творы беларускіх пісьменнікаў Польшчы неаднаразова выходзілі асобнымі выданнямі, друкаваліся ў беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісах і газетах. Пасольства гатова аказваць садзеянне ў перадачы твораў беларускіх пісьменнікаў для публікацыі ў Беларусі.

Як Чаромха на фэсце гуляла ☞ 8

Танцавальная група з Гродна выступала некалькі разоў, паколькі да кожнага танца патрэбны былі іншыя касцюмы. Быў вальс „Галубка", полька „Шабасоўка", „Лявоніха" і полька „Эстонска". Танцораў зала за кожным разам узнагароджвала бурнымі апладысментамі.

Чаму варта наведаць Дубіцкую гміну? ☞ 9

Прабыванне на тэрыторыі Дубіцкай гміны дастаўляе небывалай нагоды для кантактаў не толькі з мясцовай прыродай, але і з гісторыяй ды культурай, напр. кожны ліпень ладзіцца тут беларускі фэст. Турыстычнай цікавінкай з'яўляецца таксама суіснаванне розных традыцый і рэлігій.

Усядаць, дзверы зачыняць! ☞ 11

Помніце? Кожны мае ў памяці якуюсь станцыю, дзе чакальню са скрыпучай падлогай абагравала вугальная печка, іншае цяпло. Білетная каса з праёмам пад шыбаю — мы падсоўвалі грошы, а касірка нам білет, карычневаты, цвёрды, з кардонкі, з выбітай спецыяльным прыборам датай. І хрыпучы голас з мегафонаў...

Беларусь — беларусы

Павал Мажэйка свабодны

2 верасня стала вядома, што ў гродзенскага журналіста Паўла Мажэйкі, які быў асуджаны на два гады абмежавання свабоды за паклёп на Аляксандра Лукашэнку, скончыўся тэрмін пакарання. Дакладней, тэрмін пакарання скончыўся яшчэ 30 жніўня, але толькі ў аўторак яму паведамілі, што ён зняты з уліку крымінальна-выканаўчай інспекцыі Кастрычніцкага раёна Гродна.

Нагадаю, што год таму П. Мажэйка пачаў адбываць пакаранне ў жлобінскай „хіміі". Там ён знаходзіўся шэсць месяцаў, працаваў на тартаку ў прыватнага гаспадара. За тое, што з яго боку не было за гэты час ніякіх парушэнняў рэжыму, суд перагледзеў справу, і ён вярнуўся ў Гродна „ўмоўна датэрмінова". Яшчэ год пакарання быў скасаваны па амністыі.

Паўгода П. Мажэйка ў Гродне быў беспрацоўным, аднак працягваў займацца грамадскай дзейнасцю — некалькі месяцаў запар ён узначальвае гродзенскую філію Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Апошнія тыдні Павал Мажэйка займаецца аднаўленнем пашпарта, гродзенскай прапіскі і пячаткі „ва ўсе краіны свету", якія яму скасавалі на тэрмін пакарання. Па яго словах, гэта вельмі складаная працэдура, паколькі нават ягоным бацькам трэба было з'явіцца ў пашпартны стол і паведаміць, што яны не супраць, каб сына ізноў прапісалі ў іхнай кватэры. Увесь час штомесяц яму даводзілася адзначацца ў пастарунку, а таксама на кватэру з праверкамі наведваўся ўчастковы міліцыянер.

На сённяшні дзень у Беларусі працягваюць адбываць пакаранне па артыкуле 367 ч. 2 Крымінальнага кодэкса РБ „Паклёп у дачыненні да прэзідэнта РБ" яшчэ два журналісты. Рэдактар зачыненай газеты „Рабочы" Віктар Івашкевіч, які зараз знаходзіцца на „хіміі" ў Баранавічах, вызваліцца ў снежні. Тэрмін пакарання Міколы Маркевіча, рэдактара зачыненай „Пагоні", скончыцца ўвесну 2004 года. Праўда, М. Маркевіч ужо паўгода, як таксама „ўмоўна датэрмінова" вызвалены і працуе ў адной з прыватных фірмаў.

Міхал Карневіч

„Биржа информации", 04.09.2003 г.

Нежаданы госць

Чуткі аб тым, што на фоне ўсё складанейшых адносін з расійскім кіраўніцтвам беларускія ўлады пачнуць шукаць паразуменне з Захадам аказаліся перабольшаныя. Апошні выпадак з прадстаўніком АБСЕ па свабодзе сродкаў масавай інфармацыі Фраймутам Дувэ яскравы гэтаму прыклад.

На першыя дні верасня быў запланаваны візіт у Беларусь гэтай прадстаўнічай персоны. Аднак візіт сарваўся па прычыне нявыдачы беларускім міністэрствам замежных спраў візы. Свае дзеянні чыноўнікі патлумачылі прапановай Фраймуту Дувэ наведаць краіну крыху пазней — у сярэдзіне верасня, калі ў Мінску будзе праходзіць семінар пад эгідай Савета Еўропы па пытаннях адаптацыі беларускага заканадаўства да еўрапейскіх стандартаў, а беларускі парламент распачне разгляд праекта новага закона аб СМІ.

Па ўсім відаць цяперашнія беларускія ўлады па-свойму разумеюць работу міжнародных арганізацый і іх прадстаўнікоў. Калі прымаць за слушную тую пазіцыю, што ў Беларусь могуць прыязджаць высокія замежныя госці толькі тады, калі гэтага захоча вышэйшае мясцовае кіраўніцтва, то хутка можна прыйсці да высновы, што ўсе рашэнні, якія прымаюцца міжнароднымі арганізацыямі, як і графік работы іх афіцыйных прадстаўнікоў, павінны ўзгадняцца з беларускай уладай. А інакш усё гэта будзе нейкім свавольствам і ўмяшаннем ва ўнутраныя справы.

Але ў сапраўднасці, як бы гэта ні было прыкра афіцыйнаму Мінску, справы выглядаюць па-іншаму. І тэрміны сваіх візітаў, як і кола асоб, з якімі хочуць сустракацца, вызначаюць менавіта госці. І ўсё адбываецца на падставе таго, што тая ці іншая краіна гэта не прыватная ўласнасць трымаючых уладу, а насельніцтва — не паднявольныя рабы, магчымасць кантактаў якіх з наваколлем вызначаюць наглядчыкі. Функцыі па ўзгадненні, а дакладней — згодзе структур дзяржаўнай улады на прыезд у краіну той ці іншай персоны сканчаюцца на выдачы ці нявыдачы гэтай персоне ўязной візы. Калі яна выдаецца, значыць, улады краіны не маюць нічога супраць, каб адпаведны чалавек, згодна законных падстаў знаходзіўся на іх тэрыторыі. Калі ж не, то мясцовае кіраўніцтва лічыць небяспечным для дзяржавы з'яўленне гэтай асобы. Звычайна такое практыкуецца ў адносінах да злачынцаў і правапарушальнікаў. Ні да той, ні да другой катэгорыі вышэйадзначаны дыпламат не належыць. Таму нават прапанова наведаць Беларусь двума тыднямі пазней не магла быць прычынай адмовы ў візіце ў той час, калі Фраймуту Дувэ было зручней. Але гэта па звычайнай, чалавечай логіцы, згодна з якой „гасцям заўсёды рады" і „госць у дом — Бог у дом". Што ж да логікі лукашэнкаўскага чынавенства, то яна, па ўсім відаць, цалкам адрозная ад агульнапрынятай. Але і ёй можна знайсці тлумачэнне.

Цягам апошніх гадоў сітуацыя са свабодай сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі застаецца, бадай, самай праблемнай у Еўропе. Тое ж АБСЕ, і ў прыватнасці сам Ф. Дувэ, няспынна крытыкавалі беларускія ўлады за адносіны з прэсай. І небеспадстаўна — крымінальны пераслед журналістаў, закрыццё шэрагу незалежных газет і агульны наступ на свабоду слова ў многім выкрывалі хлуслівую сутнасць фраз аб тым, што „дэмакратыі ў Беларусі больш, чым у Еўропе".

Рэакцыя на такую крытыку, як бачым, наступіла, але своеасаблівая. Замест выпраўлення сітуацыі, прызнання памылак і недахопу вопыту ў спробах цывілізаванага дачынення з незалежнай прэсай, беларускае кіраўніцтва спрабуе „пускаць пыл у вочы" міжнародным прадстаўнікам, падчас уласна арганізаваных семінараў і пасяджэнняў. Каму ад такіх паводзін становіцца горш? У канчатковым выніку, акрамя беларускай дзяржавы, нікому. Бо мяркую, што абээс'ешнік Дувэ крыўду ад неатрымання беларускай візы праглыне — не ў першы раз. І ад настойлівай прапановы прысутнічаць на вышэйзгаданым семінары, верагодна, адмовіцца. У рэшце рэшт, мільярдам людзей на планеце няма справы да сітуацыі са свабодай слова ў беларускай краіне, кіраўніцтва якой аддае перавагу жыццю не па законах, а па сваіх „паняццях".

Уладзімір Лапцэвіч

Пародыя гісторыі

[1 ☞ працяг]

праўднасці імі не былі, значыць, да далучэння Мазовіі да Польшчы. Тое ж рабіў Віталдас Адаміс, які ў Горадні вольнаму мазавецкаму люду надаваў баярскія правы. У ваколіцах Драгічына больш за 30 працэнтаў жыхароў з шляхецкім радаводам. А гэта ўжо фактычна незвычайнае ў еўрапейскім маштабе і ёсць нагода пасвяткаваць.

— А ці была на гэтый тэрыторыі шляхта беларуская?

— Так. Дарэчы, няпраўда, што большасць шляхты была мазавецкага паходжання. Дакладней, паколькі не праводзіліся ніякія доследы ў гэтай справе, нельга вызначыць ці большасць шляхты была рускай ці мазавецкай. Напрыклад, сёння Лапінскія перакананы, што яны не рускага паходжання, а на маю думку — так. І так са шматлікімі родамі.

— У рамках святкаванняў спасылаюцца на ваяводу Івана Сапегу. У польскіх энцыклапедыях успамінаецца ягоны род, як літоўскі. У некаторых беларускіх падручніках гаворыцца пра рускія карані Сапегаў. Які гэта быў род?

— Калі хтосьці хоча быць дакладны, дык гэта быў род рускі, не літоўскі. Сапегі заўсёды выступалі як русіны і нават на пачатку XVIII ст., калі старабеларуская мова перастала быць дзяржаўнай на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і была выціснута пальшчызнай, то якраз Сапегі ўсчалі бунт, між іншым, пад лозунгам вяртання рускай мовы.

— Наколькі русіны мелі свой удзел у далучэнні заходняй часткі Падляшша да Кароны?

— Гэта трэба было б таксама даследаваць. Вядома, аднак, што тагачасны рускі народ, бо ж не было падзелу на беларусаў і ўкраінцаў, паказаў сваю няспеласць, і, напрыклад, руская магнатэрыя не гарантавала далучэння да Кароны на прынцыпе хоць бы Рускага княства. Вырашыў асабісты інтарэс. Руская эліта не змагла павесці сябе як народ і, як сёння можна сказаць, прадала нацыянальную справу.

— Вы, як гісторык і як беларус, жыхар сённяшняга Падляшскага ваяводства, раней Сувальскага, Ломжынскага і Беластоцкага, як ацэньваеце ідэю, як гэта называюць арганізатары, „абходаў 490 гадавіны ўтварэння Падляшскага ваяводства"?

— Гэта не надта ўдалая ідэя. У тагачаснага Падляшша няма нічога супольнага з сённяшнім. Спасылацца на такія карані няма найменшага сэнсу. Да таго лічу, што сённяшняе ваяводства не павінна называцца Падляшскім. Гэта пародыя гісторыі. Гэта штучны твор, хоць бы таму, што ўваходзіць у ягоны склад тэрыторыя былога Ломжынскага ваяводства, а няма тут, напрыклад, Белападляшскай зямлі. Гэтае ваяводства не павінна ані называцца Падляшскім, ані спасылацца на гісторыю.

— Значыць, сілай дарабляецца гісторыя да штучнага твору?

— Менавіта.

Гутарыў Мацей Халадоўскі

Фонд імя Льва Сапегі атрымаў папярэджанне

Грамадская арганізацыя Фонд імя Льва Сапегі атрымала папярэджанне ад Міністэрства юстыцыі Беларусі. Там палічылі, што супрацоўнікі магілёўскай філіі Фонду парушылі закон, калі дазволілі браць удзел у семінарах сябрам незарэгістраваных грамадскіх арганізацый.

Уладзімір Шанцаў, кіраўнік магілёўскай філіі Фонду імя Льва Сапегі, патлумачыў, што апошнім часам ягоная арганізацыя ладзіла семінары разам з актывістам нямецкіх маладых сацыялістаў Янам Бушам, які быў дэпартаваны з Беларусі з-за палітычных прычын.

— Нас пакаралі за сувязь з нямецкім адмыслоўцам, але насамрэч прэтэнзіі і да яго, і да фонду імя Льва Сапегі — штучныя. Закон не забараняе браць удзел у семінарах каму заўгодна. Міністэрства юстыцыі, відавочна, выконвае загад „зьверху", — лічыць Уладзімір Шанцаў.

Хартыя '97, 2.09.2003 г.

Спрашчэнне прыгранічнага руху

Еўрапейская камісія 1 верасня г.г. запрапанавала спрашчэнне прыгранічнага руху шляхам увядзення новага тыпу віз, якімі галоўным чынам карысталіся б суседзі пашыранага Еўрасаюза, значыць, Беларусь, Расія і Украіна. Камісія тлумачыць прапанову жаданнем аблегчыць дробны гандаль і сямейныя кантакты. Дармовая віза з тэрмінам важнасці ад году да пяці гадоў дазваляла б уязджаць на 50 км углыб еўрасаюзнай краіны. Максімальны час аднаразовага прабывання на такой візе — сем дзён. Забаронена было б працаўладкаванне ў краінах ЕС. Пасля атрымання візы граніцу можна будзе перасякаць без дадатковых фармальнасцей.

Прапанову Камісіі павінны падтрымаць урады еўрасаюзных краін. Еўрапейская камісія хоча, каб гэта сталася яшчэ да пашырэння ЕС, значыць да 1 мая 2004 г. (вл)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гайнаўскія белліцэісты прыступілі да вучобы з новымі сіламі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Навучальны год распачаўся з выступлення дырэктара Яўгена Сачко

Вучыцца з першага дня

У першы дзень школьнага года ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы былі арганізаваны дзве лінейкі. Настаўнікі асобна сустракаліся з гімназістамі і ліцэістамі, якія будуць вучыцца ў адным школьным будынку. Разам распачало вучобу амаль 540 вучняў. За грошы выпрацаваныя школай у час канікулаў былі адрамантаваны 3 залы, калідор на трэцім паверсе і настаўніцкі пакой.

На спатканне з ліцэістамі прыбылі павятовы інспектар па справах асветы Уладзімір Петручук, старшыня Беластоцкага аддзялення Таварыства супрацоўніцтва „Польшча — Усход" Дыянізы Сідорскі, яго намеснік Веслаў Сакалоўскі і сакратар Арганізацыйнага камітэта Алімпіяды беларускай мовы Таіса Фацееў. Госці прыбылі з узнагародай для вучніцы белліцэя Анны Маркевіч. У канцы мінулага школьнага года яна, як прадстаўнік Падляшскага ваяводства, атрымала вылучэнне на цэнтральных элімінацыях XXXIV Дэкламатарскага конкурсу „Паэзія і проза на ўсход ад Буга". Арганізатары конкурсу ўручылі лаўрэатцы дыплом і фотаапарат. За самую лепшую дэкламацыю на беларускай мове вылучэнне і кніжную ўзнагароду прызначыў Ані Маркевіч пасол Павел Латушка. Падзяку атрымаў таксама настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі, які рыхтаваў Аню да конкурсу.

У гэтым годзе выпадае пяцідзесятая гадавіна з дня правядзення ў Гайнаўскім белліцэі першых экзаменаў на атэстат сталасці. У канцы навучальнага года плануецца з гэтай нагоды арганізаваць чарговы з'езд выпускнікоў школы. Навейшымі інфармацыямі будзе папоўнена кніжка аб гісторыі школы, якую апрацоўвае былы настаўнік белліцэя Васіль Сакоўскі. Дырэктар Яўген Сачко раіў ліцэістам вучыцца з першага дня і напомніў вучням пра новыя экзамены на атэстат сталасці, якія ў наступным годзе будуць здаваць сёлетнія другакласнікі. Ужо з верасня настаўнікі будуць дакладна інфармаваць ліцэістаў аб патрабаваннях на матуральных экзаменах. Вучням і настаўнікам цяжка адназначна акрэсліць ці новая матура будзе лепшай за цяперашнюю.

— Новыя экзамены на атэстат сталасці па беларускай мове лепш правераць веды і ўмеласці вучняў. Аднак некаторыя ліцэісты могуць не справіцца з матуральнымі працамі тэрмінова. Найбольш апасаемся за тыя асобы, якія раней не вучыліся беларускай мове. За два з паловай гады цяжка вучням навучыцца граматна пісаць сачыненні на беларускай мове. Добра было б, каб побач працаўнікоў вышэйшых навучальных устаноў у матуральных камісіях былі настаўнікі беларускай мовы, якія на практыцы ведаюць узровень навучання роднай мовы ў сярэдніх школах, — згодна заявілі настаўніцы беларускай мовы Вольга Сянкевіч і Іаланта Грыгарук. — З другога боку добра, што пісьмовыя працы правяраць будуць настаўнікі з-па-за школы. Хаця стараемся быць аб'ектыўнымі, то часам цяжка правільна ацаніць працы, ведаючы хто іх напісаў.

Дырэктар паінфармаваў пра змены ў арганізацыі вучобы. Раздзяліў ён дадатковыя платныя гадзіны на працу пазаўрочных гурткоў. Апрача заняткаў спалучаных з паасобнымі прадметамі, вучні будуць маглі пісаць іконы і займацца спортам. У школе будуць дзейнічаць тэатральны і прадметны гурткі беларускай мовы, Клуб беларускіх спраў „Граблі" і беларускія калектывы „Знічка" ў ліцэі і інструментальна-вакальны ў гімназіі. У гэтым годзе павялічваецца колькасць стыпендыяў для гайнаўскіх белліцэістаў. Фундатарамі стыпендыяў з'яўляюцца Марк Сабалеўскі з Варшавы, Праваслаўны фонд „Дастойнае жыццё" і Таварыства ў карысць эстэтычнага развіцця з Беластока. Для найлепшага па вучобе ліцэіста прызначаецца стыпендыя прэм'ер-міністра. У гэтым годзе будзе атрымліваць яе Іаанна Врублеўская. Вучні, у якіх складаныя сямейныя ўмовы будуць карыстацца даплатамі да абедаў, а вучні з вёсак — аднаразовымі дапамогамі на школьныя патрэбы. Плануецца, што праз год стыпендыі будуць атрымліваць таксама трое выпускнікоў школы. У гэтым годзе прадбачваецца стварыць пры белліцэі фонд, які будзе накопліваць сродкі на дадатковыя стыпендыі для вучняў і выпускнікоў. Асобы зацікаўленыя ўдзелам у працы фонду і дапамогай могуць званіць па тэлефоне 68 22 496 і кантактавацца з віцэ-дырэктарам Аляксандрам Лаўрыновічам.

Аляксей Мароз

У Новай Волі

Зноў за парты

У Новай Волі новы 2003/2004 навучальны год пачало 55 вучняў у класах 0-VI. Навучаць іх будуць Вольга Стоцкая (дырэктар Пачатковай школы), Дарота Яўняк, Кацярына Шэршань, Тамара Пучко, Яўгенія Казбярук, Юстына Аскроба, Анна Вуйтовіч і настаяцель Нававольскай парафіі а. Яраслаў Шчэрбач.

Пачатковая школа ў Новай Волі ў цяперашнім будынку існуе ад 1960 года. Сёлета адрамантавалі ў ёй чатыры залы, два калідоры ды лесвіцу. У мінулым годзе адрамантавалі дах, ды ўсю электраўстаноўку. На школьнай пляцоўцы паставілі новыя гойданкі, з'язджальні, драбінкі ды пабудавалі паласу перашкод. У школу прыехалі вучні з Бяндзюгі, Сушчы, Круглага Ляска, Мацейкавай Гары, Каляснога, Плянтаў і Супруноў. Тут будуць вучыцца таксама некаторыя дзеці з Бандароў, Юшкавага Груда, Ціванюкоў, Баршчэва і Імшара. Для дзяцей увесь час будзе адкрыта святліца — нават у суботу і нядзелю. У школе ёсць бібліятэка, а ў ёй 3 700 кніжак. Ужо ёсць і камп'ютэры. Нядаўна купілі стол для настольнага тэніса і спецыяльныя вароты ды іншае аснашчэнне для хакея.

У мінулым навучальным годзе інструктарка Гміннага цэнтра культуры ў Міхалове Барбара Філіпчук вяла заняткі па музыцы і танцах. Вучні ахвотна ўдзельнічалі ў шматлікіх гуртках зацікаўленняў, між іншым, у пластычным, дэкламатарскім,чытальніцкім, арфаграфічным, экалагічным і матэматычным. Васемнаццаць вучняў паспяхова здалі экзамены на роварную карту. Дзеці ўдзельнічалі ў чатырох экскурсіях.

Нававольская школа ганарыцца сваімі вучнямі, якія дабіваюцца поспехаў у навуцы. Гэта Іаанна Дамброўская, Марэк Васько, Магда Нос, Анжэліка Васько, Мацей Харкевіч, Ілона Петрасяк, Міхал Грыц і Ева Васько.

Янка Целушэцкі

Беларуская мова ў Беластоку

[1 ☞ працяг]

лі ў Беластоку, у беларускі садок хадзіла іх дачка Яна.

У час канікул быў праведзены капітальны рамонт будынка. Адноўлены дыдактычныя залы і кухня. У садку зараз свежа і калярова, у калідоры сухі басейн з мячыкамі.

— Сярод спонсараў былі бацькі нашых выхаванкаў, — адзначае Луцыя Неміровіч.

У гэты годзе самая рэкордная колькасць навучэнцаў — 46 дзетак.

— Здаецца, што яшчэ будзе нас больш, — пані дырэктар не скрывае задавальнення. — Звоняць нам бацькі і дапытваюцца пра садзік. Пяць навучэнцаў даязджае з Засцянак і Грабоўкі (гміна Супрасль). Цікава, што інфармацыя пра беларускія аддзелы ідзе прыватным каналам: бацькі даведваюцца пра іх ад знаёмых, суседзяў, сваякоў.

У беларускіх групах працуюць пяць настаўніц: Альжбета Рудчук, Данута Тымашэвіч, Ева Гняздоўская, Анна Бабік і дырэктарка прадшколля.

У традыцыі прадшколля ўсталявалася мастацка-дыдактычная праграма „Ад народнасці да тоеснасці". У тэатр, на этна-народным рэпертуары (у большасці напісаным бацькамі), гуляюць разам бацькі, настаўнікі і дзеткі.

— У Беластоку хочацца працаваць, — кажа Аліна Ваўранюк, — бо тут заангажаваныя бацькі.

У гэтым напрамку таксама добрая змена — большасць навучэнцаў са звычайных беластоцкіх сем'яў, якія не звязаны прафесійна з беларускай мовай.

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Клас I „ц" беластоцкай Гімназіі н-р 7 з выхавацелькай Уршуляй Штабэльскай-Копа

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі стажыроўкі цікавіліся самаўрадавай дзейнасцю ў Польшчы

Стажоры з Беларусі ў Гайнаўцы

Беларускі самаўрадавы форум у РП з 25 па 28 жніўня арганізаваў у Гайнаўцы стажыроўку для самаўрадаўцаў, фермераў і журналістаў з Беларусі. Госці спаткаліся з мясцовымі самаўрадаўцамі, прадпрымальнікамі, гарадскімі і павятовымі чыноўнікамі.

У Гайнаўскім аддзяленні Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі яго кіраўнік Мікола Яноўскі расказаў пра падрыхтоўчыя работы па прыстасаванні сельскай гаспадаркі да ўмоў абавязваючых у Еўрасаюзе. Беларускіх гасцей цікавілі варункі працы мясцовых гаспадароў і рэнтабельнасць паасобных галін сельскай вытворчасці. Фермерства ў Беларусі пачынае толькі развівацца і фермерам прыходзіцца змагацца з многімі цяжкасцямі. Напрыклад, не стае грошай на разбудову фермаў, а крэдыты — дарагія. Няўстойлівыя таксама юрыдычныя ўмовы гаспадарання.

Дырэктар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы Яўген Сачко пазнаёміў гасцей з умовамі вучобы ў белліцэі. Пасля ўдзельнікі стажыроўкі наведалі Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы. У час сустрэчы з прадстаўнікамі беларускіх арганізацый госці даведаліся пра актыўнасць гэтых суполак на Гайнаўшчыне. Выявілася, што жыхары ўсходніх рэгіёнаў Беларусі часта не ведаюць пра беларусаў Беласточчыны. У Павятовай установе працы і Самастойным публічным комплексе аховы здароўя ў Гайнаўцы госці даведаліся пра сацыяльную і медыцынскую апеку ды стан працаўладкавання на Гайнаўшчыне.

— У Беларусі беспрацоўе не з'яўляецца яшчэ вялікай праблемай, але будзе павялічвацца колькасць людзей, якім спатрэбіцца сацыяльная дапамога. Інфармацыі, якія здабудуць у нас удзельнікі стажыроўкі, дапамогуць ім перамагчы складанасці ў час трансфармацыі беларускай гаспадаркі, — сказаў старшыня Беларускага самаўрадавага форуму Міхась Андрасюк.

Удзельнікі стажыроўкі размаўлялі з прадстаўніком Фонду развіцця мясцовай дэмакратыі пра задачы самаўрадаў у час гаспадарчай трансфармацыі. Госці цікавіліся падзелам бюджэтных сродкаў і кампетэнцыямі самаўрадавых органаў.

— Я заўважыў, што ў вас мясцовыя органы самакіравання больш адкрытыя на патрэбы людзей, а іх кантроль больш публічны, чым у Беларусі. У нас адбываецца канцэнтрацыя самаўрадавых структураў. Тлумачыцца яна пераходным перыядам. Але ж гэты перыяд ужо цягнецца дзесяць гадоў, — сказаў Аляксандр Жучкоў, старшыня праўлення Грамадскага аб'яднання „Фонд імя Льва Сапегі", якое арганізавала набор на стажыроўку ў Польшчы.

Дэпутаты з Беларусі прысутнічалі на сесіі Рады Гайнаўскага павета, на якой разглядаліся пытанні еўрапейскай інтэграцыі, сацыяльнай дапамогі і падзелу бюджэтных сродкаў. У Сельскагаспадарчым прадукцыйным кааператыве ў Макаўцы госці пазнаёміліся з сучаснымі метадамі свінегадоўлі і арганізацыі харчовай вытворчасці. Макаўскі кааператыў прадстаўлены быў як прыклад удалага пераходу з традыцыйнага калгаснага гаспадарання на сучаснае ўпраўленне сельскай гаспадаркай. Госці з Беларусі наведалі таксама прыватную гадоўлю кароў спадара Ярмоціка ў Ваневе і Нарваўскую гміну.

Сустрэчы на Гайнаўшчыне маглі адбыцца дзякуючы фінансавай дапамозе Канцылярыі прэм'ер-міністра польскага ўрада.

Аляксей МАРОЗ

Будзе новы сенатар

Толькі якім коштам? Такое пытанне ставіць сабе кожны чалавек, які плаціць усё большыя падаткі і не ведае куды дзяваюцца яго грошы. Два месяцы таму беластоцкі сенатар Адам Ямруз быў абраны членам Вярхоўнага суда і згодна з законам пакінуў Сенат. У такім выпадку закон прадугледжвае выбар новага дэпутата вярхоўнай палаты польскага парламента. Кошт такой палітычнай акцыі складзе больш за 2 мільёны злотых. Каб вылучыць аднаго сенатара, трэба ў Падляшскім ваяводстве узнавіць усе камісіі — як падчас звычайных выбараў, правесці выбарчую кампанію, арганізаваць выбарчыя ўчасткі.

Мясцовыя палітычныя кланы масава рушылі змагацца за крэсла свайму чалавеку. Вядома, выбарчая кампанія вядзецца за кошт дзяржаўнага бюджэту, а перамога — гэта ручаёк грошай у партыйную касу. Каталіцкія групоўкі пачалі выбарчую кампанію ў Гарадской радзе ў Беластоку, забараняючы будаваць царкву ў адным з кварталаў горада. Разлічваюць яны, што такім чынам мабілізуюць касцельны электарат, сваю „чорную сотню". У адказ з праваслаўнага епархіяльнага цэнтра выйшаў адназначны сігнал пра поўную падтрымку Царквы Саюзу левых дэмакратаў. Быццам нічога новага не адбылося, але ў чарговы раз на Беласточчыне замацаваўся палітычны падзел грамадства на левых-праваслаўных і правых-каталікоў.

Пры нагодзе праваслаўныя радныя пачалі выказвацца пра праследаванне нацыянальных меншасцей. У ваяводстве, у якім пражывае каля 200 тысяч праваслаўных, толькі 50 тысяч беларусаў, астатнія назвалі сябе палякамі. У горадзе Беластоку беларуская меншасць не мае сваіх прадстаўнікоў у гарадской радзе, хаця можа нехта з радных і адчувае сябе беларусам, але выбаршчыкі галасавалі на яго як на эсэлдоўскага і праваслаўнага паляка. Беларускі камітэт не набраў адпаведнай колькасці галасоў, таму што сярод праваслаўных беларусы складаюць цяпер меншасць.

Усё паказвае, што падчас выбараў галоўнымі акцёрамі ў гэтым спектаклі будуць дзеячы Саюза левых дэмакратаў, Права і справядлівасці ды Лігі польскіх сем'яў. СЛД прыкідваецца сябрам усіх меншасцей, прымае ў свае рады ахрышчаных у царкве таварышаў, але на гэтым сяброўства канчаецца. Ліга сама сабой уяўляе антыбеларускую групоўку, а яе мясцовыя лідэры афіцыйна выказваюцца, што беларуская нацыя тут не існуе. Часам дэманструюць як бы адмарожаны з канца трыццатых гадоў шавінізм. Права і справядлівасць, маючы ў сваіх радах такіх дзеячаў, якія адкрыта ўсхваляюць пасляваенную дзейнасць „Бурага" на Беласточчыне, таксама сябрам беларусаў не стане. Ёсць яшчэ нейкія іншыя камітэты, але маргінальнага значэння.

Атрымліваецца, калі няма беларускага камітэта, няварта ў выбарчую нядзелю выходзіць з хаты. Усе кандыдаты абяцаюць выбаршчыкам змаганне за іх шчаслівую будучыню і ўсе пасля выбару аднолькава змагаюцца за будучыню сваю і сваіх кланаў. З-за адсутнасці грошай на прапаганду і арганізацыю выбараў, нават калі б узнік беларускі выбарчы камітэт, яго кандыдат прапаў бы ў прапагандысцкім шуме. Вялікія партыі ангажуюць штабы людзей і мільёны злотых, купляюць журналістаў, сацыёлагаў, палітолагаў, акцёраў. Добра арганізаваная выбарчая прапаганда дае часам сенатарскае або пасольскае крэсла звычайнаму пастуху, і калі толькі падымае ён руку ў адпаведны момант ды не ездзіць захутка аўтамабілем у нецвярозым відзе, можа прасядзець у парламенце доўгія гады.

У дэмакратычнай сістэме якасць улады найчасцей бывае адлюстраваннем узроўню палітычнай культуры грамадства. Палітычныя эліты могуць быць толькі такімі, якімі люд іх уяўляе. Нічога лепшага ў палітычнай арганізацыі грамадства ніхто яшчэ не прыдумаў. Па волі люду сярод палітыкаў апынаюцца мафіёзі, зладзеі, ашуканцы. Яны прадстаўляюць таксама інтарэсы свайго асяроддзя. Аднак іх колькасць у парламенце адлюстроўвае таксама маральны стан грамадства. Пачуццё бязвыхаднасці і безнадзейнасці прымушае сотні тысяч людзей галасаваць на тых, якія адкідаюць сэнс усіх пераўтварэнняў пасля 1989 г. і абяцаюць знішчыць сістэму, якая прывяла іх у прыніжаючае становішча. Люд спадзяецца на цуды. У XX стагоддзі гэткае спадзяванне прывяло да ўлады Леніна, Мусаліні, Гітлера. Польшчы ў даны момант таталітарызм не пагражае, але эканамічны крызіс і крымінальныя скандалы з удзелам высокіх палітыкаў набліжаюць умовы для адабрэння грамадствам нейкай формы аўтарытарнай улады. У суседняй Беларусі такой формай кіравання дзяржавай задаволеная большасць грамадзян. Палякі, хаця да гэтага не прызнаюцца, псіхічна больш падобныя на беларусаў, чым на якую-небудзь іншую нацыю ў свеце.

Яўген МІРАНОВІЧ

Вачыма паляка

Дыялог праз Маскву

„У Нямеччыне ўсё няма свядомасці новых суседзяў Еўрасаюза. Краіны былога Савецкага Саюза часта ўпісваюцца ў сферу ўплываў Расіі", — напісаў нядаўна ў „Выбарчай газеце" Генінг Тэвэс, дырэктар Фонду Конрада Адэнаўэра ў Польшчы. Дзеліцца ён сваімі роздумамі наконт адносін Нямеччыны і іншых заходніх краін, у іх ліку ЗША ды Польшчы, да Расіі і краін, якія мяжуюць з Польшчай на ўсходзе. Назіраючы за міжнародным палітычным жыццём, цяжка не пагадзіцца з дырэктарам, што, калі Польшча хоча быць верагоднай для партнёраў з ЕС, не можа быць „паталагічна антырускай". Я сказаў бы болей: не можа быць таксама „паталагічна антыбеларускай". Тэвэс сцвярджае, што ў Заходняй Еўропе няма ведаў як пра гаспадарчую сітуацыю, так і грамадскія працэсы ў Расіі, таму Польшча можа адыграць ключавую ролю ў супольнай еўрапейскай усходняй палітыцы (пры згаданай вышэй умове). Я б тут пайшоў яшчэ далей: пазбаўляючыся русафобіі і набліжаючыся да Расіі, як гэта зрабілі Нямеччына ці Францыя ў справе Ірака, а дакладней — што таксама падкрэслівае Генінг Тэвэс — дзеля супрацьвагі імперскай амерыканскай палітыцы, у Польшчы ёсць шанц наладзіць кантакт з беларускімі элітамі ўлады, незалежна ад таго, ці гэта будзе каманда Лукашэнкі, ці апазіцыі, сёння яшчэ бліжэй неакрэсленай. Гэта ж датычыць і Украіны ды іншых краін былога СССР.

Здаецца, дыялог у найбліжэйшыя гады з Беларуссю, не буду казаць, што адразу блізкае супрацоўніцтва, магчымы толькі пры паразуменні з Расіяй, ад якой у найважнейшай справе — гаспадарчых пытаннях, Беларусь „закаранела" залежная. Тым больш, што ўсё паказвае на тое, што асцярожная ў адносінах да Захаду, а нават часам і напышлівая замежная палітыка Беларусі не паддасца зменам, калі верыць сігналам з Мінска пра спробы чарговага прэзідэнцтва цяперашняга кіраўніка беларускай дзяржавы.

Аднак, пакуль што, найважнейшай справай застаецца выпрацоўка яснай агульнаеўрапейскай палітыкі ў адносінах да Расіі. Памойму, Польшча адна з гэтым не справіцца. Няраз прыводзіўся прыклад, які быццам меў паправіць польска-рускія адносіны, — візіт Уладзіміра Пуціна ў Варшаве ў студзені 2002 г., але ён несапраўдны. Амаль паўтара года пасля гэтай падзеі засталося ўражанне, што прэзідэнт Расіі прыехаў хутчэй, каб „паведаміць" і то не Варшаве, а партнёрам за Одрай аб сваёй гатоўнасці адкрыцця. Думаю, што мы слаба ўсведамляем сабе, што для Крамля і для саміх расіян мы — народ можа мілы, але дзяржава ў нас малая, а ў выніку малазначная і слабы з нас партнёр для імперыі, якая выходзіць з крызісу ды шукае партнёраў вартых вялікай Расіі. У Маскве ўсё блукаецца думка з лозунга расслаўленага Алай Барысаўнай Пугачовай: „Курица не птица" (далей было: „Польша не заграница").

Неабходная перш за ўсё змена стэрэатыпа, вобразу Польшчы ў Расіі. Не толькі таго, што Варшава з Масквы бачыцца як „паталагічна антырасійская". Пакуль не пераканаем да сябе Масквы, ні на што не здадуцца спробы саўдзельніцтва, а тым больш уплыву на ўсходнюю палітыку Еўрасаюза. Прытым супольная гісторыя, з яе трагічнымі матывамі, не можа тут быць заложнікам. Польшчы трэба стварыць вобраз краіны прыхільнай, прыязнай Расіі, але таксама рашучай — стрымана. Да гэтага, аднак, павінны пераканацца самі палякі, не адразу становячыся, як немцы, аб якіх успамінаў Тэвэс — русафіламі. Хопіць, што перастанем празывацца: „гэтыя рускія", дарэчы, як і расіяне — „эти палячишки".

Калі сучасная Масква нам даверыць, неабязкова пакахае (хоць, беручы пад увагу разнастайныя сантыменты, і гэта магчыма), будзе значна больш шанцаў на польска-беларускі дыялог.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мікола Гайдук

Мроі (2)

(працяг; пачатак у 36 н-ры)

— Пацярпі, пацярпі валадар, твая рана не такая страшная, вылекуешся з яе, — суцяшаў стары, кладучы перавязку на Цюймавы бок. — Горш з іншымі: у магілу класці ўжо пара, а я тут сам, не адолею пацягаць іх ды яму выкалупаць якую.

— А дзе Чарнушка? — прастагнаў Цюйма.

— У палон пагналі.

— Хто?

— Жамойць, а хто ж бы іншы.

— О-о-ох...

— Ну, лепш жа ў палон, чымсьці ў зямлю, — закрактаў званар. — Бач, палавіна ўсяе твае дружыны легла покатам, поўную царкву труп'я наклалі, разам з айцом Сафроніем і дзякам Дзямянам. Дзе ні кінь вокам, усюды паміраючыя валяюцца. А пра пасад дык і гаварыць няма чаго: нікога, пэўне, не асталося, бо ніхто яшчэ сюды ад іх не аказаўся.

А няшчасце навалілася на Драгічын у велікодную ноч 1274 года. Жмудзіны падабраліся к гораду скрыта. Заселі ў надбужанскіх зараснiках і чакалі зручнага моманту.

Па даўняму звычаю перад поўначчу, як азваўся на званіцы благавест, стражы апусцілі ўзвадны мост і расчынілі вароты крэпасці, каб пусціць на малітву ў царкву людзей з пасада. Гэта толькі і было патрэбна жмудзінам, падпоўзшым пад самыя вароты. Прапусціўшы некалькі дзесяткаў пасадскога люду перад сабою, адна іх частка кінулася ў крэпасць, другая — у пасад. У крэпасці яны перабілі ўсю старожу, уварваліся ў грыдніцу і пасадскія харомы, рэжучы або вяжучы там усіх, потым скочылі ў царкву. Нехта з іх пусціў стралу ў званара, каб замоўкшым звонам даць знак сваім у пасадзе, што ў крэпасці ўсё ідзе спраўна. Страла ўпілася ў сцягно званаровай калекай нагі. Шугай крыкнуў ад болю, але сцяміўшы ў чым справа, закусіў да крыві губы, напружыўся, вырваў стралу з нагі, абкруціў разарванай кашуляй рану і замёр у цёмным куточку званіцы. Такім чынам ён міма волі стаў самым што ні ёсць лепшым сведкам-назіральнікам. Праз некаторы час храп і енк параненых і ўміраючых перайшоў у радасныя воклічы жмудзінаў, што гаварыла аб іх перамозе. Яны, перавязаўшы палонных, узяліся за рабунак. Тое самае, відаць, дзеялася і ў пасадзе. Там таксама снавалі па завулках палаючыя паходні і чуваць было задаволеныя воклічы наезнікаў. Калі ўстала пахмурная і сырая раніца, Шугай прыўважыў, што жмудзінаў і ў крэпасці, і ў пасадзе не так ужо і многа — якіх дзве-тры сотні ўсяго, і яны не збіраюцца тут заседжвацца. На дзядзінцы крэпасці безупынна павялічваўся гурт коней з прытрочанымі мяхамі, поўнымі награбленай здабычы ды расшыраўся натоўп перавязаных палонных. Сярод іх ён і заўважыў пасаднікаву жонку Чарнушку. Неўзабаве наезнікі, ведучы за повады коней ды паганяючы бізунамі перад сабою грамаду прывязаных да жэрдкаў палоннікаў, пачалі спускацца з крэпасці. Падобны натоўп выплыў таксама з пасада і яны абодва, злучыўшыся, зніклі за пагоркам на гасцінцы, што вёў у бок Бранска і далей на поўнач, у жмудскія землі.

Ні пасаду, ні крэпасці захопнікі не падпалілі. Не хацелі, мабыць, падаваць знаку суседнім надбужанскім крэпасцям пра свой побыт у Драгічыне і выклікаць пагоні.

Слухаючы расказ Шугая, Цюйма то енчыў, то скрыгітаў зубамі, невядома: ці то ад болю ў ране, ці то ад згрызоты па страце любімай жанчыны, дружыны, чэлядзі, дабытку.

Праз паўтара тыдня са сталіцы княства, горада Холма, у Драгічым прыбыў з дружынаю сам князь Юры Львовіч. Агледзеў разграбленыя крэпасць і пасад, выслухаў расказы астаўшыхся ў жывых драгічынцаў, але з пагоняй за жмудзінамі не спяшаўся. На нямое благанне, што вычытаў ён у расшыраных болем і гарачкаю вачах Цюймы, мовіў:

— Здаецца, мінулі ўжо тыя часы, калі Русь біла Літву. Днесь настаў час, што літоўскія суліцы ў рускіх грудзях усё часцей будуць гразнуць. Што ж, князь Міндоўг, збудаваўшы моцнае княства, хоць сам і згінуў ад рукі сваіх жа родзічаў, але ахвоту іншым даў. Вось цяперашні князь Трайдэн яго і наследуе. Бач, не толькі ўсю зямлю літоўскую ў адно княства сабраў за чатыры гады свайго панавання, але і па надбужныя гарады рукі працягнуў. Ты ж добра ведаеш, што мінулай зімою ён у Горадні ўмацаваўся, Свіслач захапіў, а вясною па рацэ Нарве свае старожы расставіў? Літва цяпер не за Бобраю топельнаю, а вось тут, побач, за ракою Нарваю стаіць. Не да пагоні нам. Трэба брацца за ўмацаванне крэпасці і да абароны рыхтавацца.

(працяг будзе)

Да ўвагі літаратараў

Пасольства гатова аказваць садзеянне

У Беларусі ведаюць і высока цэняць творчасць беларускіх пісьменнікаў і паэтаў замежжа, якія несумненна ўзбагачаюць сучасную беларускую літаратуру і ўносяць важкі ўклад у яе папулярызацыю ў свеце. У Польшчы гэта перш за ўсё літаратары, якія з'яўляюцца членамі Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа".

Па меры магчымасці, беларуская дзяржава імкнецца выдаваць творы беларускіх аўтараў, што жывуць за мяжой. Творы беларускіх пісьменнікаў Польшчы неаднаразова выходзілі асобнымі выданнямі, друкаваліся ў беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісах і газетах.

Па выніках нядаўняга спаткання з членамі літаб'яднання „Белавежа" Г. Валкавыцкім і А. Анішэўскай, звярнуўся я да Міністэрства інфармацыі Беларусі з прапановай актывізаваць супрацоўніцтва з беларускімі пісьменнікамі Польшчы. Як паведамілі ў міністэрстве, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова „Літаратура і мастацтва", у якую зараз уваходзяць часопісы „Нёман", „Полымя", „Крыніца", „Сусветная літаратура", „Маладосць" і газета „ЛіМ", а таксама рэдакцыя газеты „Культура" выражаюць гатоўнасць працягваць вышэйзгаданую практыку і чакаюць новых твораў ад беларускіх аўтараў з Польшчы.

Пасольства гатова аказваць садзеянне ў перадачы твораў беларускіх пісьменнікаў для публікацыі ў Беларусі.

Разам з тым, як нам уяўляецца, адной з рэальных магчымасцей данесці мастацкае слова да шырокага кола чытачоў, у тым ліку і ў Беларусі, з'яўляецца ўдзел беларускіх пісьменнікаў Польшчы ў Рэспубліканскім конкурсе на лепшы літаратурна-мастацкі твор, які ў красавіку 2003 года аб'яўлены Міністэрствам інфармацыі Беларусі і выдавецтвам „Мастацкая літаратура".

Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў па выніках конкурсу будуць выдавацца дзяржаўнымі выдавецтвамі Беларусі.

У дадатку дасылаю ўмовы Рэспубліканскага конкурсу з перакананнем, што гэтая прапанова зацікавіць беларускіх літаратараў Польшчы.

Павел Латушка
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы

Еўратрасянка па-беластоцку

Тое, што ў Беластоку любяць перахрысціць любога іншародца — ведаюць усе. Вось такі Дзміцер становіцца ў нас Мечыславам, Вера — Веранікай, Люба — Лаўрай, і г.д.

Апошнім часам у нашым горадзе пайшла мода на еўратрасянку. Цікава, што ініцыятарам гэтай новай з'явы выступіла самая культурная ўстанова правінцыі: ВААК — арганізатар Фолькавых сустрэч.

Яшчэ далёка да мерапрыемства ў горадзе затрубілі пра этнагурт „Uri'a" з Мінска. Пра „Uri'a" пісалі мясцовыя штодзённікі, гаварыла тэлебачанне і радыё, абвяшчалі афішы.

— Што гэта за гурт? — званілі сябры і жадалі паяснення.

— Забі, не скажу! Першы раз чую...

Словам, поўная неразбярыха.

Таму, нягледзячы на дождж і халадэчу, я разам з сябрамі пашпарыла на канцэрт. „Uri'a" мела выступаць у гарадскім парку Плянты, ля каляровых фантанаў.

На месцы выявілася яшчэ адна незвычайнасць. Сярод публікі пераважалі маладзёны — пастаянныя наведвальнікі „Басовішча". Ужо з першай песні яны кінуліся пад сцэну гуляць пога і запатрабавалі, каб лідэр гурту гаварыў „tylko po białorusku".

Апошніх крытыкавалі незадаволеныя пенсіянеры, якія чамусьці спадзяваліся пабачыць калектыў накшталт „Прымакоў" або „Маланкі". Калі ля сцэны пагаслі каляровыя фантаны, пенсіянеры разышліся дамоў.

— „Ур'я"! „Ур'я"! „Ур'я"! — крычаў вядучы канцэрт. Індаеўрапейскія і палескія рытмы поўнасцю зачаравалі публіку. Спадабалася ўсё — насычаныя энергетыкай песні, інструменты, адзенне. Найбольшы фурор выклікалі дзяўчаты, якія выйшлі на сцэну ў намітках з Давыд-Гарадка. Гэты галаўны ўбор напамінае высокі турбан і тую ж Індыю.

— А якое ў вас дачыненне да этнагурту „Юр'я"? — пытаю пасля канцэрта мінскіх музыкаў.

— Як — якое дачыненне? — спевакі глядзелі на мяне з недаверам, — мы ж самі „Юр'я"!

У час размовы высветлілася акалічнасць, якая па сутнасці і рассакрэціла ўсю блытаніну. У заяўцы пра сябе мінчане далі інфамацыю на беларускай і англійскай мовах. Ужо перад канцэртам, беларускія музыканты здзівіліся, калі ўбачылі на афішах у Беластоку тое „Uri'a".

— Ale to nie da się inaczej po polsku napisać, — адказалі ім арганізатары.

Цяпер, калі іду па вуліцы „Jurowieckiej" у цэнтры Беластока правяраю, ці пад уплывам „niemożliwości napisania tego inaczej po polsku" не памянялі яе назвы на „Uri'owi'ecka".

Ганна Кандрацюк

Умовы правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурна-мастацкі твор

Заснавальнікамі Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурна-мастацкі твор з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і выдавецтва „Мастацкая літаратура".

Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення новых таленавітых аўтараў, павышэння прэстыжу беларускай мастацкай літаратуры, а таксама канкурэнтаздольнасці твораў беларускай літаратуры на міжнародным кніжным рынку.

У конкурсе могуць прыняць удзел аўтары, якія пішуць на беларускай ці рускай мовах.

Конкурс на лепшы літаратурна-мастацкі твор (проза, паэзія, драматургія) праводзіцца па двух намінацыях: літаратура для дарослых і дзіцячая літаратура.

Для ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца неапублікаваныя творы, якія раней у выдавецтвах „Мастацкая літаратура" і „Юнацтва" не разглядаліся. Кожны аўтар можа даслаць толькі адзін рукапіс.

Конкурс з'яўляецца закрытым. Рукапісы (2 экземпляры дасылаюцца бандэроллю на адрас: 220600, г. Мінск, праспект Машэрава 11, выдавецтва „Мастацкая літаратура" з пазнакай „На конкурс". На кожным экземпляры рукапісу павінен быць змешчаны аўтарскі дэвіз. У бандэроль неабходна ўкласці заклеены канверт са звесткамі пра аўтара (прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас, пашпартныя звесткі), на канверце павінен быць указаны толькі аўтарскі дэвіз.

Рукапісы, якія дасылаюцца на конкурс, павінны быць афармлены ў прыдатным да разгляду выглядзе. Друкаваць творы неабходна на паперы стандартнага фармату, на старонцы павінна быць 30 радкоў, даўжыня радка 57-58 знакаў, уключаючы прабелы (проза, драматургія). У гэтым выпадку адзін аўтарскі аркуш роўны 23 старонкам машынапіснага тэксту (40 тыс. знакаў). На старонцы паэтычнага рукапісу павінна быць таксама не больш за 30 радкоў. Адзін аўтарскі аркуш паэзіі складае 700 радкоў. Усе старонкі рукапісу неабходна пранумараваць. Для тэкстаў, раздрукаваных з камп'ютэрнага набору, захоўваюцца аналагічныя патрабаванні.

Памер конкурсных празаічных твораў не павінен перавышаць 12, драматычных — 8, паэтычных — 5 аркушаў.

Рукапісы для ўдзелу ў конкурсе прымаюцца на працягу года, пачынаючы з дня апублікавання дадзеных умоў. Падвядзенне вынікаў завершыцца да 1 кастрычніка 2004 года.

Для падвядзення вынікаў конкурсу створана журы з прадстаўнікоў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікаў выдавецтва „Мастацкая літаратура", вядомых літаратараў, якое будзе знаёміцца з прапанаванымі творамі і ацэньваць іх. На заключным пасяджэнні тайным галасаваннем журы вызначыць пераможцаў конкурсу.

У кожнай з дзвюх намінацый прадугледжваецца па 3 пераможцы (1-е, 2-е, 3-е месцы). Пераможцы атрымаюць Дыпломы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, а іх творы будуць выпушчаны ў свет выдавецтвам „Мастацкая літаратура".

Заснавальнікамі конкурсу прадугледжана шырокая рэкламна-інфармацыйная падтрымка твораў-пераможцаў, а таксама актыўнае „прасоўванне" іх на расійскі кніжны рынак, у тым ліку шляхам выпуску ў свет беларускамоўных твораў у перакладзе на рускую мову.

Зорка

старонка для дзяцей

Напэўна, сёння там плач і лямант? — думала я, ідучы ў беларускі садок. Звычайна першыя дні ў прадшколлі самыя неспакойныя, крыклівыя. Расстанне з бацькамі, сястрычкамі ды брацікамі — балючае. Ідзе тут, зразумела, пра наймалодшых — дзетак у трохгадовым узросце.

Ужо на парозе выявілася, што ў садку панує спакой і настрой працы ды гульні. Старэйшыя дашкольнікі вучыліся пісаць. Асабліва ўважліва паводзілі сябе хлопчыкі, якіх мы разам з настаўніцамі ледзь намовілі сфатаграфавацца ў „Зорку".

У суседняй зале, упрыгожанай каляровымі насценгазетамі, кніжкамі, цацкамі ды народнымі вышыванкамі займаліся наймалодшыя. Дзяўчаткі круціліся каля настаўніцы, якая, як добрая матуля, брала іх на рукі, частавала, суцешвала ласкавым словам. А вось, старэйшыя хлопчыкі цалкам забыліся на апошніх — яны цалкам пагрузіліся ў гульню самаходзікамі.

— Б-р-р-р-р-р-р-р-р-р-ы! — гудзела ў іх кутку. Шум грузавікоў і аўтамабіляў узнімаўся над аркушам паперы, які ўяўляў скрыжаванні гарадскіх дарог.

У іншым кутку сабраліся будучыя музыканты. Адзін з іх „іграў" на гармоніку, а ўсе апошнія чакалі сваёй чаргі.

— Здаецца, у вас зараз больш хлопцаў, чым дзяўчынак? — пытаю апякунак-настаўніц.

— Так! — адказваюць. — Чамусьці — так!

У новым навучальным годзе ў польска-беларускі садзік у Беластоку, што па вуліцы Пілсудскага, ходзяць каля паўсотні дашкольнікаў. У садок прывозяць дзяцей з усяго Беластока і наваколля.

З малечамі працуюць вопытныя і мілыя настаўніцы: Ева Гняздоўская, Альжбета Рудчук, Данута Тымашэвіч, Анна Бабік і дырэктарка прадшколля Луцыя Неміровіч.

Праз год частка шасцігодкаў пойдзе у ПШ н-р 4, каб далей вывучаць беларускую мову.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Старшакі" ўжо з першага дня хацелі пісаць у сшытках

У беларускім садзіку

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Настаўніца Данута Тымашэвіч — як добрая матуля

Вершы Віктара Шведа

Чаму адлятаюць буслы?

Настаўніца пытае
На ўроку Яніну:
— Чаму буслы адлятаюць
У цёплыя краіны?

Падказка Адама
Прагучала гэтак:
— Бо негры таксама
Хочуць мець дзетак.

Прапаў сабака

На лаўцы ў парку сядзеў хлапчына
І безупынна горка плакаў.
Яго спыталі: — Што за прычына?
Сказаў хлапчук: — Прапаў сабака.

— Не плач, ты ў тым не вінаваты, —
Хлапчыну суцяшалі людзі.
— Сабака вернецца дахаты,
Але што тут са мною будзе?

Міра Лукша

У верасні

Песні лета адспявала,
Сена звезла, збожжа зжала.
Спее бульба на палетках,
У асенніх градах кветкі.
Вучні рушылі у школу
Чарадой жывой, вясёлай.
Калідоры, двор і залы
Доўга гоману чакалі,
Зырка ў шыбах выглядалі
Дзетак з летніх сініх даляў.
І паселі дзеці ў партах,
Каб у навуку ісці ўпарта.

Ніна Мацяш

Гаварушкі

Што скажу вам на вушка:
Я да жніўня хадзіў у адведзіны.
Там грыбы гаварушкі
Абступілі мяне колам ведзьміным.
Папрасіліся ў кошык,
Самі сталі ўсе ўголас прасіцца:
— Забяры нас, Сярожык,
Бо ўжо ў гэтай траве не сядзіцца!
Але будзь асцярожным,
Набірай нас у кош — хоць пад дужку,
Ды не кожную можна
Ужываць-спажываць гаварушку...
Сніў я гэта, ці мроіў?
Жнівень вяліў душанку на схіле...
Прызнаюся, са мною
Першы раз так грыбы гаманілі!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Будучыя музыканты прыліплі да гармоніка

Шэры-шэры верабейка

Даўным-даўно былі на свеце толькі два колеры: шэры і чорны. Нават сонейка было шэрым, а ўсе дрэвы — чорнымі. Сумна і маркотна было ў такім лесе. Тут і птушкі не спявалі, ды і самі яны былі непрывабныя.

У такім вось лесе жыў верабейка Том. Кожную раніцу птушкі ляталі ў лясную школу, а верабейка Том прапускаў заняткі, бо любіў паспаць. І вось аднае раніцы ў сумны, маркотны лес завітаў мастак. Ён пачаў размалёўваць дрэвы, кветкі, птушак. Ад радасці птушкі весела заспявалі і сваімі спевамі разбудзілі верабейку.

— Што гэта за музыка? — запытаў Том у малінаўкі, якая пралятала побач. — І чаму ты такая прыгожая?

— Мяне размаляваў мастак, а спяваць я пачала ад радасці, — весела адказала малінаўка. Махнула крыламі — і паляцела...

Верабейка Том усхапіўся і паляцеў шукаць мастака. Але мастака нідзе ўжо не было.

Так і застаўся верабейка шэрым, а замест песні ў яго выходзіць толькі адно чырыканне. Восенню многія птушкі адлятаюць на поўдзень, вераб'і ж не ляцяць, бо ўсё чакаюць таго мастака, які калісьці так прыгожа размаляваў дрэвы, кветкі, птушак...

Маша Красоўская, Гомельская вобласць, Петрыкаўскі раён, Капаткевіцкая СШ

Хахол

У садзе растуць маладыя яблынькі ды грушкі. Пасадзіў іх яшчэ дзед Максім на месцы, дзе рос стары сад. Дзедку казаў сусед-аднагодак (а былі яны тады найстарэйшымі мужчынамі ў вёсцы): „Нашто табе садзіць дрэвы?! І так не будзеш есці пладоў! Мы ўжо сваё адсадзілі, адсеялі, адпланавалі... Хай маладыя садзяць ды сеюць, іх час прыйшоў. А то парабіліся дармаеды з іх такія, што і пададзенага ў рукі ўзяць не хочуць..." Дзед Максім сказаў суседу: „Нічога, Мікола, сад ад мяне застанецца новы. І расці будзе, калі мяне ўжо не стане." Дзедкі Максіма не стала праз тры гады. А сад расце. А дзед Мікола, стары ўдавец, якога дзеці і ўнукі ў Беластоку жывуць, з зайздрасцю, пэўна, спаглядае, як суседскія праўнучка з праўнукам бегаюць па Максімавым садку. Бы тыя парасткі сярод дзедавай рукой пасаджаных маладых дрэўцаў. І дзеду Міколу хочацца, бы да сваіх, да іх прытуліцца. Ганулька ды Жоржык і яго дзедкам называюць, як усіх старэнькіх у вёсцы. Праўда, бабулькі амаль адны ўжо тут жывуць... І кожны дзед з бабкай з радасцю глядзяць на чужых дзетак. „От, жывое сярод нас, старых!" — кажуць. Усе яны хочуць з тым жывым паразмаўляць, самім ажывіцца, адчуць подых маладосці. А Ганулька ды Жоржык не супраць — так цікава гамоніцца са старымі. І параду дадуць, і пра былое раскажуць. Здаецца, што казку якую страшную пачуеш — і пра вайну, і пра гора, і радасныя аповеды, як у вёсцы весела было, як усе на лавачках спявалі, гулялі... А парады такія цікавыя...

— Вось, вашы дрэўцы апрануць на зіму трэба, — кажа дзецям дзед Мікола.

— Як гэта? На зіму? Ад холаду?

— І ад холаду, і ад зая.

— Што зай зробіць дрэўцам? Кару абкусае? Ад голаду? Дык шкада зая... — Ганульцы аж вочкі закругліліся: уявіла беднага зайку, як трасецца на гурбе снегу.

— Зайку можна накарміць, падкінуць яму сена, морквы, а яблыньку ахутаць трэба ў салому. Хахол надзець.

— Такая сукенка! — смяецца суседка, бабка Тэкля. — Гэта не жарты!

— Яблынькі яшчэ ў сукенках, — заўважыў Жоржык. — Лісце носяць.

— Ліст упадзе, і холад яблыньку трэсці будзе, — зазначыў дзед Мікола.

— А адкуль узяць добрую салому на хахол? — задумаўся Жоржык. — У нашага таты камбайн яе так змалаціў, а пасля яе скачалі ў цюкі...

— У мяне ёсць добрая, доўгая салома! — дзед Мікола сам скасіў жыта на невялікім загоне — сеяў крыху збожжа для сваіх курэй. — Ідзем, выбярэм.

І старыя, і малыя апраналі Максімавы яблынькі на доўгую, марозную зіму.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пачатак навучальнага 2003/2004 года ў ПШ н-р 4 — II „а" клас з выхавацелькай Іалантай Кузьміцкай

Шчаслівыя другакласнікі

„Зорка" пабывала на ўрачыстым адкрыцці новага навучальнага 2003/2004 года ў ПШ н-р 4 у Беластоку. Нашы сябры — навучэнцы беларускай мовы — шчасліва вярнуліся ў школу. Многія з вясёлымі іскрынкамі ў вачах расказвалі сябрам пра летнія прыгоды. Наймалодшыя засумавалі за сваёй настаўніцай, яны не маглі дачакацца сустрэчы ў сваім класе з выхавацелькай.

На здымку вучні другога класа (тут беларуская група) з выхавацелькай Іалантай Кузьміцкай. У першым радзе навучэнцы беларускай мовы.

Зорка

Міхась

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Адным з наймалодшых удзельнікаў дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова 2003" быў Міхась Саковіч. Міхась — навучэнец польска-беларускага прадшколля ў Беластоку. Хлапчук ужо другі раз прымаў удзел у конкурсе. Як добры дашкольнік, цудоўна запрэзентаваў свой садок. Ён апрануў кашульку з сэцам і надпісам: Я ♥ БЕЛАРУСКІ САДОК

Міхась адважна „паставіў" на сцэне „Міколкавы пытанні" аўтарства Міхася Пазнякова.

Хлопчык атрымаў вылучэнне ў Нараўцы і разам з бацькамі і сястрой Магдай цешыўся поспехам. На элімінацыях пабывала ўся сям'я Саковічаў.

Зорка

Вершы Віктара Шведа

Адаптаваны

У школе паявіўся
На занятках Алік.

Калі ты нарадзіўся?
Хлопцы запыталі.

Хлопец зажурыўся,
Пачуўся пагана.
— Я не нарадзіўся,
Я адаптаваны.

Пагроза

(Беларуская народная казка)

Ехаў мужык з базару, запазніўся, на двары ноч зацягнулася. Заехаў да знаёмага гандляра ды просіцца нанач.

— Заплаці пяць рублёў, калі ласка, — адказаў яму гаспадар.

Мужык згадзіўся, прывязаў каня, сам лёг і адпачывае.

Апоўначы ўстаў, ідзе каня пакарміць. Бачыць — няма ні каня, ні павозкі. Вярнуўся ў хату і кажа пра тое гаспадару. А той, быццам і не чуе.

— А ці вароты ты зачыніў? — усміхнуўся пад носам гандляр.

— Зачыніў, а як жа.

— Відаць, слаба ты іх зачыніў, — не адставаў гаспадар.

— Нічога! — махнуў рукой мужык. — Відаць, давядзецца і мне зрабіць тое, што мой бацька зрабіў.

І пайшоў спаць ды смела спіць. Гаспадар вельмі здзівіўся, словы мужыка не давалі яму спакою. Выйшаў паціху з хаты, прывёў каня, прывязаў яго да павозкі ды разбудзіў начлежніка.

— Чалавеча, нешта на двары стукае. Ці не конь твой вярнуўся?

Мужык на гэта:

— А як сабе ён хоча — хоча ёсць, хоча няма. І так зраблю тое, што мой бацька зрабіў.

Раніцай устаў, запрог каня і ў дарогу збіраецца. А гандляр, бы тая смала, начапіўся:

— Скажы, скажы, што твой бацька зрабіў! — не дае ад'ехаць, за колы ўчапіўся, трымае.

— Давай дзесяць рублёў, скажу, — абыякава заявіў мужык.

Цяжка было гандляру выкласці грошы, бо скупы ён быў ды ласы на чужое, як кот на мяса.

— Ну, кажы хутчэй! — гандляр выклаў рублі і пераступае ад нецярплівасці. — Ну, што твой бацька зрабіў?

— Што зрабіў? — засмяяўся мужык. — А нічога. Калі ўкралі ў яго каня, хадзіў пехатою.

Сказаў, засмяяўся на ўсю вуліцу і пагнаў каня з усіх сіл. Багаты гандляр падняў крык, але мужыка ўжо і следу не было.

(гак)

Польска-беларуская крыжаванка № 37:

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 33: Казка, мат, рамонак, пасол, сакавік. Верас, раса, замок, кола, зман, каза, кок.

Узнагароду — запісную кніжку — выйграў **Пятрусь Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Аўтэнтычнасць з прыгажосцю

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Бельскія „Куранты”

На беларускі фэст у Бельску-Падляшскім, арганізаваны Галоўным праўленнем БГКТ і яго павятовым аддзелам, Управай горада ды Бельскім домам культуры, прыбылі два калектывы з Беларусі. У гарадскім амфітэатры перад бельскай публікай выступіў ансамбль беларускай песні „Ярыца” з Мастоў і танцавальная група Гродзенскага вучылішча мастацтваў. Госці з Беларусі заспявалі апрацаваныя фальклорныя песні і паказалі народныя танцы. Старшыня галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі, які разам з бурмістрам Яўгенам Беразаўцом адкрываў фэст, пахваліў таксама мясцовыя беларускія калектывы. Побач вядомых бельскіх „Васілёчкаў” выступіў мужчынскі хор „Куранты”. Узнік ён паўгода таму і дзейнічае пры Бельскім доме культуры. Яго заснавальнікам з'яўляецца царкоўны харыст Павел Лемеш, а дырыжорам — Аліна Кос, якая раней апекавалася „Лісічкамі” з Ласінкі.

— Паколькі мы прадстаўнікі беларускага асяроддзя, у нашым рэпертуары каля 40% беларускіх песень. Папаўняем іх украінскімі і рускімі песнямі, якія спяваюцца на нашых вяселлях. Зараз патрэбны нам касцюмы і акардэон, але няма сродкаў. Звярнуліся мы за дапамогай да бурмістра, але дарэмна. На пачатку фінансава ўспамог нас дырэктар бельскага „Максбуду”, а цяпер арганізуем дзейнасць за складчыны. Хаця калектыў існуе пры БДК, рэпетыцыі арганізуем у памяшканні Лігі абароны краіны, бо там добрыя ўмовы для канцэртнага спеву, — патлумачыў Павел Лемеш. У хоры 16 мужчын, сярод якіх 6 царкоўных харыстаў. На акардэоне акампаніруе Мікола Сідарук.

Сярод публікі паявіўся новаабраны войт Арлянскай гміны Міхал Іванчук. Прымаў ён віншаванні ад самаўрадавых дзеячаў і прысутных на фэсце пісьменнікаў.

— Людзі прапанавалі мне вярнуцца на пасаду войта і таму рашыўся прыняць удзел у выбарах. Хачу зараз дакончыць усё тое, чаго не паспеў, — заявіў Міхал Іванчук у размове з Віктарам Шведам, Юркам Баенам і Міхасём Хмялеўскім, якія падпісвалі свае кніжкі.

— Ужо хіба не вернуцца добрыя часы для продажу маіх кніжак. Калісь у вясковай школе ў Пашкоўшчыне прадаў я за адзін дзень 250 кніжак. Сёння ў Чыжах прадаў 7 экземпляраў, а ў Бельску пакуль спакойна, — сказаў Віктар Швед.

Харысты Гайнаўскага дома культуры праспявалі апрацаваныя фальклорныя беларускія песні. Хаця калектыў вядомы бельскай публіцы, новы рэпертуар зацікавіў сабраных. Зараз гайнаўскія харысты ў моцна змененым складзе выступаюць на фэстах, каб здабыць вопыт перад зімовымі конкурснымі змаганнямі. Адзіным маладзёжным калектывам з Беласточчыны была „Лучына”, якая дзейнічае пры Галоўным праўленні БГКТ у Беластоку. Паколькі калектыў узнік нядаўна, перад бяльшчанамі выступаў упершыню. Кіруе ім Гражына Валкавыцкая, а спяваюць студэнты і працоўная моладзь. Беларускія песні ў стылі фольк спадабаліся з-за меладычнасці. Меладычныя песні „Ярыцы” таксама падабаліся публіцы. Аднак найбольш цікавымі паказаліся мне песні ў выкананні „Арэшкаў”. Жанчыны з Арэшкава прэзентуюць штораз новыя даўнія песні, якія спяваліся ў час вясковых работ і адпачынку. Вельмі добра пастаўленыя галасы дазваляюць ім спалучыць аўтэнтычнасць з прыгажосцю.

Аляксей Мароз

Як Чаромха на фэсце гуляла

Беларускія фэсты ў Чаромсе сталі традыцыяй. Сёлета ГП БГКТ і ГОК арганізавалі яго ў суботу 30 жніўня. Надвор'е не паспрыяла мерапрыемству ў пленеры, таму канцэрт адбыўся ў зале. Публіку прывітала са сцэны, бадзёрай песняй і музыкай „Чарамшына”.

— Гэта каб разварушыць, — сказаў Славамір Самасюк. Варта адзначыць, што калектыў выступаў у адмалоджаным складзе, ды і рэпертуар пабагацеў на новыя творы. Калі музыканты сходзілі са сцэны, доўга не сціхалі гучныя апладысменты.

Пасля прэлюдыі „Чарамшыны” Валянціна Ласкевіч, вядучая фэсту, перадала слова гаспадарам — войту Міхалу Врублеўскаму і старшыні Галоўнага праўлення Яну Сычэўскаму. Кіраўнік самаўрада прывітаў публіку і гасцей.

— У Польшчы пражывае шмат нацый з своеасаблівай культурай. Чаромха таму прыкладам, — сказаў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. — Для кожнай з гэтых культур належыцца зразуменне і пашана. Таму сёння будзем спяваць на розных мовах: беларускай, польскай, украінскай і рускай.

Калектыў „Heavens” з Гайнаўкі праспяваў добра вядомыя песні, так што публіка спявала разам з артыстамі.

Танцавальная група з Гродна выступала некалькі разоў, паколькі да кожнага танца патрэбны былі іншыя касцюмы. Быў вальс „Галубка”, полька „Шабасоўка”, „Лявоніха” і полька „Эстонска”. Танцораў зала за кожным разам узнагароджвала бурнымі апладысментамі.

„Вульчанкі” прадставілі мясцовы фальклор. Даволі цёпла былі ўспрыняты песні, якія калісьці на вёсках на лавачках спявалі дзяўчаты.

Калектыў „Ярыца” прыехаў з Мастоў на Гродзеншчыне. Госці выконвалі беларускія ды польскія песні. Пра калектыў расказаў дырэктар Мастоўскага аддзела культуры Уладзімір Свістуноў, а канцэрт вяла Марына Ячкоўская. Выступленне „Ярыцы” было ўспрынята цёпла і сардэчна. Госці былі пад уражаннем ад такога прыёму, а дырэктар Свістуноў запісваў канцэрт відэакамерай. На развітанне перадаў войту кніжны падарунак, а вядучая пажадала жыхарам Чаромхаўскай гміны моцнага здароўя, добрага ўраджаю ў наступным годзе і самых лепшых поспехаў у сямейным жыцці.

У канцэрце ўдзельнічаў Іван Філатаў з Брэста. Малады саліст пад акампанемент гітары запрэзентаваў тры свае песні на сучасныя ў Беларусі тэмы.

У заканчэнні выступілі „Прымакі” з Гарадка. Упершыню калектыў запрэзентаваў новую песню са сваёй пятай касеты „Налівай, налівай ды выпівай”. Лідэр калектыву хутка захапіў публіку. Доўга не сціхалі апладысменты, калі гурт праспяваў на развітанне „Смэрэку”.

Слаўна гуляла Чаромха на беларускім фэсце. Пасля канцэрта моладзь танцавала на забаве. Ігралі мясцовыя музыканты з гурту „Awers”. Сардэчная падзяка належыцца арганізатарам і спонсарам. Больш бы такіх мерапрыемстваў у Чаромсе!

Уладзімір Сідарук

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Спяваюць вучні III і IV класаў ПШ у Новай Волі

Першы фэст у Новай Волі

28 жніўня дырэктарка Пачатковай школы ў Новай Волі Вольга Стоцкая пры дапамозе Гміннага цэнтра культуры ў Міхалове ды Беларускага грамадска-культурнага таварыства з Беластока арганізавала першы фэст у гісторыі гэтай вялікай вёскі.

Канцэрт вяла дырэктарка новавольскай ПШ. Найперш спявалі і танцавалі ды ігралі на музычных інструментах мясцовыя вучні. Найпрыгажэй спявалі Анна Івановіч і Паўліна Монах. Гледачам падабаліся таксама выступленні Ганараты Гайдучэні, Габрыелі Турко і Марыі Монах. На раялі іграла Клаўдзія Шчэрбач, а на скрыпцы — Караліна Буднік.

У перапынках мастацкай часткі адбыліся конкурсы. І так, у танцах перамагла пара Ян Кулеша і Вольга Стоцкая, у перацягванні каната — сям'я Васіля Паскробкі, а найхутчэй чысціла і цёрла сырую бульбу сям'я Рошкаў. У конкурсе ведаў на тэму Міхалоўскай гміны перамагла сям'я Марыі Івановіч. Быў яшчэ адзін конкурс — на найлепш падрыхтаваную салату з сырой гародніны. Журы вылучыла ажно сем асоб: Марыю Івановіч, Анну Грыку, Галіну Івановіч, Мажэну Гайдучэню, Барбару Монах, Анну Кулешу і Агнешку Філіпчук.

На фэст прыехалі фальклорны калектыў „Нараўчанкі” з Нараўкі, капэла з Дубін ды эстрадная „Лучына” з Беластока. „Нараўчанкі” праспявалі дванаццаць беларускіх песень, а капэла з Дубін ды „Лучына” — па шэсць. Хто сёлета быў на беларускіх народных фэстах у Нараўцы ды Семяноўцы, той заўважыў, што ў Новай Волі „Нараўчанкі” і „Лучына” спявалі тыя самыя песні. Па ўсяму відаць, што быў гэта іх „жалезны” рэпертуар. Канцэрт быў удалы, але доўгі — ад 15^{15} да 19^{15}.

На школьнай спортпляцоўцы не без вялікіх эмоцый адбыліся спаборніцтвы. Сярод футбольных каманд з Новай Волі, Геранімова і Міхалова пераможцамі сталі каманды „Тарнада”, „Скорасныя” і „Шалёныя” з Новай Волі. У бегах на 60-метровай дыстанцыі ва ўзроставай катэгорыі да 15 гадоў першынство заваяваў Марэк Гайдучэня, які абагнаў Паўла Грыку (II месца) і Мацея Максімюка (III). У скачках удаль ва ўзроставай катэгорыі звыш 15 гадоў пераможцамі сталі Андрэй Малашэўскі (I), Вальдэмар Белы (II) і Цэзары Кісялеўскі (III). Абсалютным чэмпіёнам па гульні ў шашкі стаў Міхал Івановіч.

Фэст у Новай Волі закончыўся народным гуляннем да другой гадзіны ночы. Да танцаў іграў калектыў „Прадказанне” („Omen”) з Міхалова.

Янка Целушэцкі

Маскоўскія цэрквы і манастыры

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Данілаўскі манастыр

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Царква Хрыста Збавіцеля

У Маскве побач Чырвонай плошчы знаходзіцца нядаўна адбудаваная Казанская царква з аднайменнай іконай Божай Маці і часціцамі мошчаў. На сценах вісяць старыя іконы, якіх не паспелі знішчыць камуністы, і новыя, уфундаваныя вернікамі. Зараз сярод людзей замацавалася перакананне, што трэба аднаўляць разбураныя камуністамі цэрквы. Выкарысталі гэта царкоўныя ўлады, рашаючыся адбудаваць храм Хрыста Збавіцеля. Вернікі з Расіі і замежжа, у тым ліку многія прадпрымальнікі фінансава ўспамаглі адбудову самай вялікай у Расіі царквы. Вернікі з Польшчы былі ўражаны манументальнасцю будоўлі. Усярэдзіне царквы Хрыста Збавіцеля многа мармуру і золата. Будаўнікі мазаікамі ўпрыгожылі ніжнюю царкву. У храме знаходзяцца дадатковыя памяшканні для выставак, магазінаў з царкоўнымі кніжкамі, літургічным начыннем і іконамі.

У храме Хрыста Збавіцеля служыць патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II. Тут адбываюцца галоўныя богаслужэнні ў час святкаванняў Уваскрасення і Раства Хрыстовага, якія транслююцца па тэлебачанні. Зараз патрыярх Алексій II служыць у Богаяўленскай царкве, якая раней была патрыяршым храмам. Знаходзяцца ў ёй мошчы свяціцеля, мітрапаліта маскоўскага Алексія і вельмі старая Казанская ікона Божай Маці. Мы маглі прылажыцца да іконы перад святкаваннямі ў яе гонар. У гэтай вялікай царкве з многімі прыгожа пазалочанымі іконамі ахвотна вянчаюцца маладыя. У час нашай пабыўкі ў Богаяўленскай царкве вянчаліся дзве пары. Дзіўным для нас было тое, што жанчыны трымалі вянцы над жаночымі галовамі. У нас трымаюць выключна нежанатыя мужчыны. Адна жанчына ў сярэднім узросце вянчалася ў звычайнай цёмнай сукенцы. Хутчэй за ўсё яе цывільны шлюб адбыўся намнога раней. Зараз рашылася на таінства, якое яе сужонства ўчыніць законным перад Богам. Апошнім часам у Расіі штораз больш старых цывільных сужонстваў рашаецца павянчацца ў царкве.

За брамай Данскога манастыра ўбачылі мы танкі, на якіх савецкія салдаты змагаліся пад Курскам. Стаяць яны на памяць грашовай дапамогі Праваслаўнай царквы для савецкай арміі ў час II сусветнай вайны. Манастыр раней быў вельмі знішчаны і запушчаны. Пасля перадачы будынкаў праваслаўным пачаўся рамонт. Адрамантаваная ўжо звонку самая вялікая царква і вядуцца ў ёй унутраныя аддзелачныя работы. Многа вернікаў прыязджае, каб прылажыцца да Данской іконы Божай Маці і мошчаў патрыярха Ціхана, праслаўленага Праваслаўнай царквой свяціцелем. Ён — змагар за праваслаўе пасля бальшавіцкай рэвалюцыі. Нявыгадны камуністам быў ён замучаны ў нявысветленых да сёння абставінах. Яго астанкі ўдалося зберагчы. Аднак і зараз царкоўным уладам няпроста пераняць усю манастырскую тэрыторыю. На праваслаўных могілках дзейнічае яшчэ свецкі крэматорый, які паганіць людскія астанкі. Урны з попелам ад спаленых целаў нават замуроўваюць у манастырскую агароджу. З прадпрыемства, якое знаходзіцца побач манастыра, вецер пераносіць выкіды на манастырскую тэрыторыю. Ад гэтага дрэвы бялеюць, быццам абсыпаны яны мукой.

Данілаўскі манастыр паказаўся нам больш адрамантаваным. Раней знаходзілася ў ім патрыяршая сядзіба. Зараз дзейнічае манастырская гасцініца, магазін з літургічным начыннем і кніжкамі. Паломнікі прыкладаюцца ў манастыры да мошчаў св. Данілы і пакідаюць грошы на рамонт. Аднаўляецца таксама Свята-Пакроўскі жаночы манастыр, у якім знаходзяцца ікона і мошчы блажэннай старыцы Матроны. Каб прылажыцца да іх і памаліцца да святой Матроны людзі прыязджаюць нават з аддаленых раёнаў Расіі. У манастыры ўбачылі мы велізарную чаргу да мошчаў старыцы Матроны і яе іконы. Весткі пра дапамогу святой Матроны хутка разыходзяцца ў народзе і таму штораз больш вернікаў прыязджае ў Данілаўскі манастыр.

Аляксей Мароз

Чаму варта наведаць Дубіцкую гміну?

Гміна Дубічы-Царкоўныя распаложана край Белавежскай пушчы ў зоне аховы краявіду з выдатнымі турыстычнымі каштоўнасцямі, якая ахоплівае экалагічна чыстыя абшары. Гаворыцца, што гэта сапраўдны рай любіцелям прабывання на ўлонні чыстай прыроды.

Істотным шанцам развіцця гміны з'яўляецца турызм. Вадаём на рацэ Арлянцы, абшырныя лясы, якія займаюць 50% гміннай тэрыторыі, чыстае паветра і адсутнасць прамысловасці з'яўляюцца тымі козырамі, дзякуючы якім у кожную пару года можна там адпачыць і акрыяць ад цывілізацыйных турбот.

Пра каштоўнасці цэнтра адпачынку „Бахматы" завёў я гутарку з яго наглядчыцай Іалантай Сохай, дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Дубічах-Царкоўных.

— Што можа запрапанаваць турыстам асяродак „Бахматы"?

— Асяродак паўстаў у 80-х гадах мінулага стагоддзя і сёння з'яўляецца гміннай маёмасцю. У ім 37 начлежных месц у 2-, 3- і 4-месных пакоях рознага стандарту. Найтаннейшы двухмесны домік шатровага тыпу, яго цана — 18 злотаў ад асобы. Гэты аб'ект забяспечаны электрычнасцю ды вадою і, хаця няма ў ім прыбіральні, карыстаецца вялікім зацікаўленнем. У найбольшым доміку, „Бахматоўцы", начлег у сярэднім каштуе 27 злотаў, столькі ж каштуе начлег і ў доме з бярвенняў. Калі, напрыклад, на двары ідзе дождж, турысты могуць паліць у камінках, а паліва ўлічана ў цану.

— А як з харчаваннем?

— База поўнасцю аснашчана кухонным абсталяваннем, якое дае магчымасць уласнаручна гатовіць сабе ежу. Калі хто вельмі лянуецца, той можа падсілкавацца ў сталоўцы „У Яна", якая знаходзіцца па дарозе з Гайнаўкі ў Кляшчэлі.

— Што цікавага прапануеце на лета?

— У летні перыяд дзейнічае пункт пракату плавальных прыбораў, байдарак, вадзяных веласіпедаў. Ёсць вызначаны два купальныя ўчасткі для дзяцей і дарослых, працуе ратаўнік. У вадаёме разводзім шляхетныя гатункі рыб і турыстам прапануем рыбалку. А грыбы можна ў нас збіраць нават на тэрыторыі асяродка; летась было многа баравікоў і маслякоў.

Нядаўна праз тэрыторыю гміны быў вызначаны 41-кіламетровы веласіпедны маршрут, „Зялёны", з Дубіч-Царкоўных у Белавежу, праз Чахі-Арлянскія, Вілюкі, Тапіла; гэты маршрут паўстаў за сродкі Сусветнага прыроднага фонду. Пазычаем веласіпеды для катання па ім. (У цэласці праз пушчу вызначана шэсць падобных маршрутаў агульнай даўжынёй у 208 кіламетраў — М. М.)

— Як многа гасцей наведвае вас і ці маеце ад сваёй дзейнасці прыход?

— Усё залежыць ад надвор'я: у гэтым годзе пачатак сезона быў безнадзейны, хмарны. Прыязджаюць госці з Варшавы, Познані, Сілезіі, а нават з Захаду. У Інтэрнэце маем некалькі рэкламных старонак.

Зімою працуюць толькі два домікі, але ёсць іншыя атракцыёны: санныя праездкі ў чароўным краявідзе.

* * *

Прабыванне на тэрыторыі Дубіцкай гміны дастаўляе небывалай нагоды для кантактаў не толькі з мясцовай прыродай, але і з гісторыяй ды культурай, напр. кожны ліпень Галоўнае праўленне БГКТ ладзіць тут беларускі фэст. Турыстычнай цікавінкай з'яўляецца таксама суіснаванне розных традыцый і рэлігій. Адзначаюцца тут важныя святы, напр. 12 ліпеня Пятра і Паўла ў Дубічах-Царкоўных, 7 жніўня — Анны ў Старым Корніне і 28 жніўня — Спленне ў Вэрстоку. Амаль у кожнай вёсцы можна пабачыць і купіць вырабы мясцовага рукадзелля.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

„Бахматы" — за вадзянымі веласіпедамі інфармацыйны пункт

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Вечарына ля хаты Семашкевічаў у Лакцянах. Чацвёрты справа сядзіць Рычард Семашкевіч

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Алесь Цыркуноў і Тэрэза Варановіч на падсумаванні пленэру і канферэнцыі ў Масцянах. На сцяне — партрэт Янкі Быліны выкананы Алесем Цыркуновым

Як Янку Быліну ў Лакцянах, Масцянах і Клюшчанах паміналі...

У днях 8-10 жніўня г.г. на бацькаўшчыне беларускага паэта Янкі Быліны (у сапраўднасці ксяндза Яна Семашкевіча) адбыліся краязнаўча-літаратурныя чытанні, прысвечаныя гэтай крыху прызабытай постаці. А нагода была асаблівая — 120 гадоў таму, 20 кастрычніка, у Лакцянах у сялянскай сям'і Уршулі і Казімера Семашкевічаў нарадзіўся сын Янка. Ахрысцілі яго ў касцёле ў Клюшчанах, дзе таксама пасля духоўнай семінарыі, 1 ліпеня 1907 г., служыў прыміцыйную імшу.

Ладзіла чытанні Грамадскае аб'яднанне „Вільняр", якое дзейнічае на Астравеччыне. Дзякуючы намаганням Ганны Чакур, журналісткі „Астравецкай праўды", і Алеся Юркойця з Варнянаў атрымалася сапраўднае свята ў гонар іхняга земляка, якому не дадзена было служыць на бацькаўшчыне. Як ксёндз Віленскай дыяцэзіі трапляў у розныя парафіі на Ашмяншчыне, Вілейшчыне і Віленшчыне, каб у 1933 г. апынуцца на Беласточчыне, дзе лёсам было наканавана служыць Богу і людзям да канца жыцця. У 1996 г., дзякуючы дапамозе Юркі Туронка, завітала я ў Бомблю пад Саколкай, дзе з 1946 г. да смерці 18 лютага 1956 г. жыў кс. Ян Семашкевіч. Раней яшчэ ў 60-я гады цікавіўся ім Мар'ян Пецюкевіч, даўні яго сябра з Лаварышкаў. Калі вярнуўся ён са ссылкі ў 1956 г., на жаль, не застаў ужо ксяндза ў жывых, але паехаў у Бомблю, зрабіў здымкі касцёла і магілы ксяндза. Пасля смерці Мар'яна Пецюкевіча калекцыя гэтых здымкаў трапіла да Юркі Туронка. Напісаўшы ў 1996 г. у „Czasopisie" тэкст „Zapomniany poeta" пра Янку Быліну на Беласточчыне, трапіла я ў лік гасцей запрошаных на канферэнцыю. Разам са мной паехала таксама Гражына Харытанюк, якая збірае ўспаміны пра ксяндза, захаваныя да сёння сярод жыхароў Янава, Ялоўкі, Міхалова, Бомблі — тых парафій, дзе менавіта ён служыў.

У Лакцянах сабралася каля 30 навукоўцаў, краязнаўцаў і мастакоў. Чытанні, дарэчы, папярэдзіў мастацкі пленэр, у якім удзельнічалі Алесь Цыркуноў, Алесь Пушкін, Віктар Маркавец, Таня Маркавец, Сяргей Харэўскі, Тэрэза Варановіч, Ірына Герасім, Алесь Буйвідовіч, Дзяніс Раманюк. Створаныя на радзіме ксяндза працы прэзентаваліся падчас чытанняў на выстаўцы ў доме культуры ў Масцянах. Апрача ландшафтных сюжэтаў у мастацкіх творах паўсталі два партрэты Яна Семашкевіча намаляваныя Алесем Пушкіным і Алесем Цыркуновым. Пры нагодзе чытанняў у суботу, 9 жніўня, у 9 гадзін адбылася таксама імша ў Клюшчанскім касцёле, дзе вельмі добра па-беларуску служыў малады ксёндз Павал з Астраўца. Мясцовы пробашч ксёндз Здзіслаў Пікула (родам з Польшчы), на жаль, расчараваў многіх удзельнікаў набажэнства сваім казаннем на польска-расійскай трасянцы. Пасля службы перад касцёлам быў устаноўлены памятны камень з мемарыяльнай дошкай, прысвечаны 120-м угодкам Янкі Быліны, выкананы лідскім мастаком Рычардам Грушам. З-пад касцёла ўсе падаліся на недалёкія могілкі, дзе пахаваная радня Семашкевічаў: бацькі ксяндза Казімер (3.02.1837 — 13.04.1918) і Уршуля (14.06.1841 — 23.03.1916), сёстры Разалія Паўкшта (13.04.1862 — 20.10.1884) і Гануля Казёл (27.05.1867 — 23.08.1926), брат Язэп (9.07.1864 — 31.03.1906). Таксама ўпісаны ксёндз Ян (радз. 20.10.1883) Пры даце смерці нехта невыразна выразаў год: „1956". Лёгка дадумацца, што ахвяравальнікам помніка быў ксёндз Ян. Тэкст на помніку, напісаны на беларускай мове лацінкай, канчаецца сказам: „Wiečny supakoj ich dušam". Над надпісамі прымацаваны здымак маладога яшчэ Яна Семашкевіча. Пасля складання кветак і адспявання „Магутны Божа" госці сабраліся ў доме культуры ў Масцянах, дзе і праходзілі чытанні: да абеду — пра грамадскі чын і літаратурную дзейнасць Янкі Быліны, і пасля абеду — пра падзеі і асобы звязаныя з Астравеччынай. Пра жыццё і творчасць Янкі Быліны рэфераты чыталі: Алесь Юркойць і Людміла Кухарэвіч з Варнянаў, Сяржук Вітушка і Леакадзія Мілаш з Вільні, Янка Драўніцкі з Камарова, Анатоль Шаршнёў з Мінска, Міхась Казлоўскі з Маладзечна. Людвіка Вітушкава зачытала на пачатак рэферат прафесара Адама Мальдзіса „Як Янка Быліна дапамог мне не стаць класікам нальшчанскай літаратуры". Сярод выступоўцаў пра Астравеччыну былі: Ганна Чакур, Герман Брэгер, Стафан Казлоўскі, Сяргей Харэўскі, Тадэвуш Дрэма, Іаланта Валуевіч, Анатоль Сцебурака.

Лакцянцы, якіх зараз няшмат у вёсцы — на 42 хаты 14 жыхароў, змаглі таксама сустрэцца з удзельнікамі чытанняў на панадворку дома, у якім нарадзіўся Ян Семашкевіч, і дзе зараз яшчэ жыве ўнук яго брата Язэпа — Рычард (нар. у 1943 г.). У сцэнэрыі прыдуманай Алесем Пушкіным адбылася мастацкая частка, дзе гучалі вершы і байкі Янкі Быліны, спявала Людміла Кухарэвіч, настаўніца сярэдняй школы ў Варнянах, у выкананні якой верш Янкі Быліны „Бацькаўшчына" стаў гімнам чытанняў:

„Chacia jana biedna i choć tak niaszczasna,
Napeunie druhoj ja takoj nie spatkaju. —
Jana mnie u myślach, jak zorańka jasna!
Jej tolki adnej swaje pieśni śpiawaju..."

Ксяндза з міжваеннага перыяду ўспаміналі найстарэйшыя жыхары Лакцянаў. Вечарыну па-мастацку вяла Лена Субаткевіч, настаўніца беларускай мовы ў Рымдзюнскай школе. Удзельнікі пленэру і чытанняў жылі ў Лакцянах, у пустых і жылых хатах, дзе адчувалася гасцінны дух лакцянцаў. Харчаваліся за адным сталом стравамі рыхтаванымі самімі арганізатарамі. Прыпомніліся мне ўспаміны жыхароў Бомблі і Пшэслаўкі, якія запамяталі ксяндза Яна Семашкевіча як вельмі таварыскага кампаньёна, які на хрэсьбінах ці проста ў гасцях у сваіх парафіян любіў весяліць кампанію сваімі жартамі і аповесцямі. І мы весяліліся ў Лакцянах па-Былінаваму ажно да белага рання. Відаць спрыяў нам яго вясёлы дух, які пэўна прысутнічаў з намі ў родных ягоных Лакцянах. Інакш ці так удалымі маглі б быць чытанні яму прысвечаныя?

Лена Глагоўская

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Дом, у якім нарадзіўся Ян Семашкевіч (Янка Быліна)

Паляўнічыя не толькі палююць

— Паляўнічы не толькі палюе, — гаворыць Яўген Адамец, лоўчы з паляўнічага гуртка „Цецярук" у Кляшчэлях, якога застаю за беларускім трактарам падчас палявых работ каля лесу. — Наш гурток, заснаваны ў 1947 годзе, налічвае 54 членаў і гаспадарыць на дзесяці гектарах засцерагальных палеткаў, у тым ліку на 3,5 гектарах абрабляемых палей, на якіх сеем два гектары аўса, гектар кукурузы — гэта пакідаем на полі, звярыне. Сеем пад гектар жыта, для ўборкі. На засцерагальных палосах высейваем авёс і садзім каля чатырох тон бульбы, якую пакідаем на зіму. Сена звярыне купляем у мясцовых гаспадароў, таму што самі не маем ні сенажацей, ні касільных прылад.

Палеткі абрабляюць усе паляўнічыя. Ці працуюць ахвотна? Кожны павінен перапрацаваць 16 гадзін у год. Кожны паляўнічы гурток з'яўляецца грамадскай арганізацыяй і без грамадскай працы яго членаў не можа існаваць і развівацца. Удзел паасобных членаў у выкананні розных гаспадарчых і арганізацыйных пачынаў вельмі розны: ад актыўнай працы ў гуртку да поўнай бяздзейнасці некаторых паляўнічых, якія найчасцей з'яўляюцца толькі на калектыўныя паляванні.

Згодна статуту, кожны член паляўнічага гуртка павінен удзельнічаць у працах у карысць лоўчай гаспадаркі і ў год выпрацаваць дзве тысячы балаў. Калі за два чарговыя сезоны паляўнік не набярэ балаў, яго можна выкрасліць са спіска членаў гуртка. Працу ўлічвае і расцэньвае лоўчы гуртка. За дакормліванне запісваецца 500 балаў, але найбольш можна атрымаць за захоп браканьера — 2 000 балаў плюс прэмія!

— Якія памеры браканьерства на тэрыторыі вашага гуртка? — пытаю.

— Апрача засцігнутага ў мінулым годзе бельскай паліцыяй нелегала, які ў маі, у ахоўны перыяд, застрэліў сарну, больш не было. Кожную зіму вышукоўваем і знімаем капканы і нат на гэтай падставе можна сказаць, што ад некалькіх гадоў браканьерства не праяўляецца. Браканьеры хіба крыху баяцца, бо ведаюць, што нашы паляўнічыя наглядаюць за лесам.

Наш гурток распараджаецца 134 і 135 егерскімі ўчасткамі плошчаю ў 15 тысяч гектараў на тэрыторыі Кляшчэлеўскай ды часткова Дубіцкай, Боцькаўскай і Арлянскай гмін.

— Якая ў вас звярына і ці вядома, колькі яе ёсць?

— 31 сакавіка г.г. быў праведзены падлік звярыны на аснове круглагадовага назірання. На двух участках налічылі ўсяго 6 ласёў, 26 аленяў, 272 сарны, 39 дзікоў, 6 ваўкоў, 5 рысей, 9 барсукоў, 34 куніцы, 50 лісоў, 370 зайцаў, 410 курапатак, 41 лясную курапатку, 52 цецярукі, 60 кабарог, 30 выдраў, 16 бабраў, 14 янотаў і 40 норак. Не налічылі ні аднаго фазана ці глушца, зубры таксама да нас не даходзяць. Рысю я сам спаткаў на жвіроўцы каля Дабрывады, пад'ехаў да яе на сто метраў, мела ашыйнік. Шаленства лісоў на нашай тэрыторыі не было; раскідваем вакцыны.

— Ці прыязджаюць да вас замежныя паляўнічыя і што іх цікавіць?

— Маем пастаянных замежнікаў з Даніі, раней былі немцы. У датчан паляванне даражэйшае, таму што там многа незгуртаваных паляўнічых, якія не маюць сваіх участкаў. У нас яны цікавяцца, галоўным чынам, адстрэлам сарнаў, з якіх забіраюць рогі. У гэтым годзе былі два чужаземцы, якія на працягу пяці дзён адстрэлілі сем штук казлоў і коз. Аднак надвор'е не спрыяла, увесь час ішоў дождж, так што палявалі яны толькі тры дні. У лес яны самі не ідуць, заўсёды прыдзяляем ім праваднікa. І чужаземец можа страляць да выбранай звярыны толькі тады, калі праваднік яму дазволіць. Шмат у нас казлоў расплодных і такіх дазваляем адстрэльваць толькі па адным, сімвалічна.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Лоўчы Яўген Адамец

— Скажыце яшчэ, дзеля чаго паляўнічыя палююць, што гэта дае?

— Бывае, што паляванне дае задаволенасць, але перш за ўсё яно праводзіцца дзеля рэдукцыі звярыны, якая наносіць шкоды гаспадарам і лесу. Напрыклад дарослы алень патрабуе 30 кілаграмаў корму ў суткі. Калі б не адбор, звярына магла б давесці да няўхільных страт у лясной экасістэме. З грошай ад продажу дзічыны ствараецца фонд, якім кампенсуем страты ў паляўнічай гаспадарцы. Паляўнічаму дастаецца толькі 20% выручкі і паляўнічыя трафеі.

Міхал Мінцэвіч

Усядаць, дзверы зачыняць!

Я ўважна прачытаў артыкул Аляксея Мароза „Чыгункай у Белавежу і Бельск-Падляшскі" ў „Ніве" ад 17 жніўня г.г. Засмуціла мяне, што ўсюды чыгуначныя лініі нерэнтабельныя і заміж паравоза з трыма або толькі адным вагончыкам у будучыні на пуцях могуць з'явіцца рэйкабусы. Але і ёсць чым узрадавацца, бо не ўсе мясцовыя чыгуначныя камунікацыі будуць ліквідаваны. Не прападуць усе чыгуначныя прыпынкі ў глыбінцы, недзе ў забытым ужо, настальгічным свеце.

Помніце? Кожны мае ў памяці якуюсь станцыю, дзе чакальню са скрыпучай падлогай абагравала вугальная печка, іншае цяпло. Білетная каса з праёмам пад шыбаю — мы падсоўвалі грошы, а касірка нам білет, карычневаты, цвёрды, з кардонкі, з выбітай спецыяльным прыборам датай. І хрыпучы голас з мегафонаў, што паведамляў пра прыезд ці ад'езд цягніка. Паравоз уязджаў, соп, сычаў, дудзеў, тармазіў са свістам выпускаючы пару што аж дух займала.

— Усядаць, дзверы зачыняць! — загадваў кандуктар.

Колькі цяпер такіх малых станцый умірае, стаяць вакзалы з пустымі вокнамі-вочамі. Выглядаюць у далечыню, ці прыедзе які цягнік: можа хтосьці выйдзе на перон. І невідушчыя і нерухомыя семафоры стаяць у адзіноце. Нават дзікі бэз штораз больш дзічэе, разрастаецца пустазелле з моцнымі каранішчамі, якое калісь заглушыць найдалікатнейшыя ўспаміны.

Андрэй Гаўрылюк

У Ласінцы

Чытаюць беларускія кніжкі

У Ласінцы і навакольных вёсках Нарваўскай гміны ёсць шмат чытачоў беларускіх кніжак і тыднёвіка „Ніва".

— Бібліятэчны кнігазбор налічвае 12,5 тысяч тамоў. У ім 225 беларускіх кніжак, — кажа бібліятэкарка Крыстына Келбашэўская. — Сёлета купілі 36 новых кніжак, найбольш мастацкай літаратуры для дарослых і дзяцей ды папулярна-навуковай. 25 сваіх уласных кніжак перадала ў бібліятэку Вера Дудзіч з Ласінкі. Сваю кніжку ахвяраваў бібліятэцы Віктар Стахвюк, ураджэнец Трасцянкі.

Бібліятэка ў Ласінцы мае радыёпрыёмнік. Школьнікі ахвотна слухаюць літаратурныя радыёперадачы, а таксама радыёпастаноўкі. З настаннем доўгіх асенніх вечароў будзе больш часу на чытанне кніжак.

„Ніву" чытаюць тут пастаянна і пазычаюць яе таксама дадому. У бібліятэку прыходзяць жыхары Ласінкі, Прыбудкаў, Гарадзіска, Барысаўкі, Катлоўкі, Крыўца, Тыневічаў-Вялікіх і Тыневічаў-Малых.

Кніжкі пазычае 84 асобы. Сярод дарослых найбольш чытаюць Альжбета Пашко з Катлоўкі, Анэта Мінько, Ірэна Мінько, Данеля Дудзіч, Вера Дудзіч, Анна Дудзіч, Люба Анапюк, Багуслава Паскробка і Аліцыя Станько — усе яны з Ласінкі, Ян Франкоўскі з Тыневічаў-Вялікіх ды Галіна Келбашэўская з Гарадзіска.

Сярод дзяцей і моладзі найактыўнейшымі чытачамі з'яўляюцца Ева Анапюк, Уршуля Беразавец, Данель Рашкоўскі, Уршуля Філіповіч і Крыстына Шварц з Ласінкі ды Анна Пашко з Катлоўкі.

Янка Целушэцкі

З Нарваўскай гміны

У Нарваўскай гміне землі слабыя (V і VI класаў) і людзі жывуць беднавата. Апрача земляробства частка жыхароў гміны працуе на мясцовых прадпрыемствах. Самае вядомае з іх — „Пронар", якое выпускае трактары і сельскагаспадарчыя машыны. Вытворчасць нарваўскага „Пронару" вядомая за мяжою краіны, напрыклад, трактары высылаюцца нават у Аўстралію. Іншае прадпрыемства выпускае экалагічныя печкі для цэнтральнага ацяплення дамоў. На цэлы рэгіён славіцца таксама сельскагаспадарчы кааператыў „Рольмак" з Макаўкі, вядомы смачнымі мясапрадуктамі. У гміне працуе яшчэ некалькі сталярскіх майстэрняў і шмат крамаў.

Нарваўскую гміну можна падзяліць на чатыры часткі. Першая — гэта сама Нарва, гмінны цэнтр з царквой, касцёлам, гміннай адміністрацыяй, домам культуры, амбулаторыяй, ветэрынарнай лячэбніцай, поштай і пастарункам паліцыі. Другая частка гміны — паўднёвая, з Тыневічамі-Вялікімі як культурным цэнтрам і трэцяя — усходняя — з цэнтрам у Ласінцы маюць добрыя дарогі і водаправоды. Але чацвёртая частка гміны, распаложаная на правым беразе ракі Нарвы, найбольш занядбаная. Войт гміны Якуб Садоўскі цяпер намагаецца і гэтую тэрыторыю давесці да парадку. У мінулыя гады ваду атрымалі вёскі Іванкі-Рагазы, Ванева, Сакі і Агароднікі, сёлета — Трасцянка і Анцуты, а ў будучым годзе водаправод пракладуць у Бялкі і Адрынкі.

У гэтым годзе, дзякуючы намаганням павятовага раднага Сцяпана Кучынскага, маюць пачаць класці асфальтавае палатно на палове дарогі (1800 метраў) з Трасцянкі ў Бялкі.

Мікалай Лук'янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Пасля вяртання з пасляшлюбнага падарожжа цешча пытае зяця:

— Скажы, якія прыгожыя месцы пабачылі вы ў час гэтай экскурсіі?

— Праўду кажучы, не помню. Не было часу глядзець у вокны гатэляў.

* * *

Маруся вяртаецца з пакупкамі ў свой жылы блок. Каля ліфта выскаквае перад ёю эксгібіцыяніст і тэатральным жэстам разводзіць свой плашч. Жанчына глядзіць і мармыча пад носам:

— Ой, забыла купіць яйкі.

* * *

— Чаму ў пеўня няма рук?

— Бо ў курыцы няма грудзей.

* * *

Суд разглядае іск супраць Васі за прысуджэнне аліментаў. У час працэсу падыходзіць да яго ягоная мамачка, расшпіляе яму распорак, патрасае рукою *corpus delicti* і пытае суддзю:

— Ну, чым жа ён меў змайстраваць таго байструка?

— Мамачка, — адзываецца падсудны, — не варушы, бо прайграем.

* * *

Перад палац шэйха заязджае аўтобус поўны пажылых жанчын.

— Зноў турысткі? — пытае шэйх.

— Не, гэта вашы цешчы прыехалі з візітам.

* * *

Жонка мужу:

— Чаму наш сабачка сёння такі злосны?

— Відаць прадчувае, што заўтра прыедзе да нас твая мамачка.

* * *

Паліцыянт запыняе самаход, які па шашы ездзіць ад дрэва да дрэва. З-за руля вылазіць зусім п’яны Янка.

— Колькі выпіў? — пытае злосна паліцыянт.

— 35 піў.

— Колькі!?

— 35 піў, ды яшчэ змагу 5, бо на гэтай шашы абмежаванне хуткасці да сарака...

* * *

— Чуў, што Брэжневу маюць зрабіць вельмі складаную аперацыю?

— Не. А ў чым справа?

— Будуць пашыраць яму грудзі, бо замала там месца для медалёў.

* * *

Санітары ўносяць да лекара паабіванага Янку.

— Жанаты? — пытае лекар.

— Не, упаў з лесвіцы.

Адгаданка

1					
2					
3					
4					
5					
6					
7					
8					

1. жыхар сярэдневяковага Смаленска, 2. кавалак распілаванага і рассечанага бервяна на паліва, 3. выдатны для квашання даўгаваты зялёны плод агароднай расліны (*Cucumis sativus*), 4. залатая, сярэбраная або бронзавая ўзнагарода прызёру, 5. драпежны пушны звер сямейства куніцавых з вострай мордай і доўгай грубай шэрсцю (*Meles meles*), 6. лічынка матыля, падобная на чарвяка, 7. поезд, 8. беларускі народны танец або агародная расліна паўднёваамерыканскага паходжання (*Solanum tuberosum*).

(Ш)

Рашэннем адгаданкі будзе слова ў светлай калонцы. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 30 нумара

Усе чэрці адной шэрсці.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Антону Казлоўскаму** з Калодна і **Мікалаю Раманчуку** з Гайнаўкі.

Недазволеная самкавая пячатка

— Штосьці трэба ўрэшце зрабіць з гэтымі самкамі, нешта за вельмі разбуяніліся яны ў нашым лесе, арганізуюцца, а нават прыстойнай справаздачы напісаць не ўмеюць адна з адной! — распачаў чарговы сход уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч.

Лань Гаўрусіха, занепакоеная мядзведжымі вывадамі, крадком глянула на вавёрку Кацюшу, якая ў сваю чаргу няўпэўнена падгарнула па сябе рудую кіту.

— Ён, здаецца, не аба мне... То ж я кожны сабраны арэшак фіксую, — падумала.

Сандар Жоржавіч паглядзеў ёй уважліва ў вочы, быццам чытаючы ў яе думках.

— Ну, што я толькі... таго... гэтага... — прамармытала вавёрка.

— Не таго і не гэтага! Не пра вас, вавёрка, гаворка! — мядзведзь рашуча перапыніў яе думкі.

— Але ж я не таго і не гэтага, — уключылася перапалоханая Гаўрусіха, заключыўшы, што калі справа не ў вавёрцы, дык, напэўна, у ёй самой.

— То ж і я ведаю, што і вы, вавёрка, не таго. Я думаю пра тых, што збіраюцца на ўскраіне ўзлеску. Гэта яны ўсё не таго і не гэтага.

Тут не паўстрымаўся ўставіць сваё слова самы давераны мядзведзеў член кіраўніцтва — дзяцел Стукач:

— Ну, вось, таго, напісалі, гэтага, што збіраюцца на ўскраіне таго, значыцца, лесу, а зусім там не збіраюцца, а ў зусім іншым месцы. Збіраюцца, вось, і тады тое самае.

— Гэтага цярпець нельга! — рашуча перапыніў дзятла Жоржавіч. — Яшчэ ў адведкі да іх прыпаўзе змяя Ссапія са сваім гэтым самым. Час закончыць гэта самае, значыць, тое гэтым.

— А кампрамат на іх у нас ёсць? — спыталася вавёрка, з палёгкай вахлюючы сябе кітай, зведаўшы, што не ў ёй справа.

— Ну, кажыце, дзяцел, што там у вас на іх ёсць, — загадаў Жоржавіч.

— Перш за ўсё пячатка іхняй арганізацыі з каштана, а гэта пярэчыць законам нашага лесу.

— Я нічога пра гэта не чула? — здзівілася лань Гаўрусіха.

— Як гэта — не?! — узлаваўся Жоржавіч.

— Сл... ухаю вас... — прашаптала лань.

— Калі слухаеце, дык ведаеце.

— Цяпер дык ведаю... Але... — лань прабавала тлумачыцца.

— Якое мне тут „але”?! Пячаць не такая, а абы-якая! Загадваю распусціць тую самкавую кампанію!

— А-алее! — аднагалосна падтрымалі рашэнне мядзведзя члены кіраўніцтва.

— Ну! — паўтарыў Сандар Жоржавіч, завяршаючы гэтым самым чарговы сход і вярнуўся ў сваю бярлогу.

Перад пасляабедняй дрымоткай адчыніў сваю таемную скрыню і зірнуў на яе змесціва. Пасярэдзіне спачывалі шматформенныя каштанавыя пячаткі, кожная дзеля іншай нагоды. Сонны, даставаў кожную з іх па парадку і ставіў штэмпелі на сцяне бярлогі роўненька адзін пры адным, аж, урэшце, адна з пячатак абсунулася на падлогу. Сандар Жоржавіч заснуў, супакоены раўнамерным гукам: штамп, штамп, штамп.

МакХолад

Селянін з белай мышкай

Мне там усё адно. Пенсія ёсць. На мяне зарабляе працаздольная частка грамадства, як і я калісьці зарабляў на старых. Бо ніхто не скажа цяпер, што я назбіраў за сваё рабочае жыццё на сваю пенсію. ЗУС тады маё выдаў на такіх як я цяпер, хоць тады было такіх менш. А, можа, і намарнаваў. Бо хопіць паглядзець на ЗУСаўскія палацы і плойму чыноўнікаў, што каб хоць бегалі з тваімі паперамі. Хутчэй кульгавы будзе насіць свае дакументы, чым яны варухнуцца са сваіх крэслаў. Цяпер, вось, зашумелі, што сельскагаспадарчая страхоўка адбірае ім кліентаў. Тамака плаціцца менш. Дык трэба зраўняць, каб грошы не ўцякалі?

Цяпер можа і не быць сваёй зямлі, каб патрапіць у КРУС. Хопіць адчыніць г.зв. спецыяльную галіну сельскай прадукцыі: гадаваць дажджавых чарвякоў, сабак, катоў, лабараторных пацукоў ці белых мышак. Тады, займаючыся самастойнай гаспадарчай дзейнасцю можна скарыстаць таннейшую КРУСАўскую страхоўку. Каб перайсці з ЗУС у КРУС, трэба зарэгістраваць на год гаспадарчую дзейнасць.

Прыйшоў параіцца ў мяне Коля Здунюк. Што гадаваць? Белых мышак? У Лёліка Назарэза, вось, намножваюцца мышаскочкі — ні то мыш, ні то малюпасенькія кенгуру. Ды іх па два ці тры злоты за штучку можаш збыць, і то пакупнікі хочуць, каб у клетцы адразу было тое стварэнне, бо пасля не зловіш. Большы клопат тую клетку для іх падрыхтаваць. А белыя мышкі? А як паўцякаюць, дык што тут будзе на пасёлку з алкашамі! Як ім у больш-менш цвярозым відзе пакажуцца, дык і гарэлкі менш скарыстаюць, а таннейшая ж яна ў Еўрасаюзе.

— Ну, якія ёсць спосабы займацца самастойнай гаспадарчай дзейнасцю, ды замест складчыны ў ЗУС аплачваць у дзесяць разоў таннейшую крусаўскую? У КРУС яна цяпер 219 зл. квартальна, а ў ЗУС — каля 700 зл. у месяц. У КРУС могуць быць застрахаваны асобы, у якіх прынамсі 1 гектар або вядуць спецыяльныя галіны гаспадаркі (у іх можа не быць і таго гектара). Той, каму закон не дае права набываць зямлю, напрыклад, чалавеку, у якога няма сельскагаспадарчай адукацыі, — цягнуў я даклад, — дык той акурат і можа адчыніць тую спецыяльную галіну гаспадаркі. Лічыцца ёю вырошчванне раслін у цяплiцах ці *in vitro* (мінімальная плошча 1 квадратны метр). Гэта можа зрабіць і чалавек, у якога гадоўля лісоў, тхора-фрэтак, янотаў, норак, шыншылаў. У спецыяльнай галіне гэта будзе таксама гадоўля лабараторных звяркоў, — паўтараўся я з любасцю, — белых мышак, пацучкоў (мінімум адна штука), а таксама коней, сабак і пародзістых катоў (таксама абы адна штука). Так, вось, калі б мая Гарэшка была пародзістая, мог бы я займацца такой гаспадаркай, прадаючы ад яе пародзістых шчанят.

— Шкада... — уздыхнуў Коля. — І мой Рэкс мог бы быць больш пародзісты...

— Ён пародзісты аж занадта, — звярнуў я ўвагу майму сябру, сабака якога нагадвае найменш шэсць парод: ногі як у такса, пыса аўчаркі, хвост дога, вушы каўказца, зубы тэр’ера...

— А і твая сучка... яе маць!.. — быццам абразіўся Коля.

— А што там нам! Мы ўжо і так на пенсіі...

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960